ЗВЯЗДА

1 лістапада 1996 г. пятніца, № 261 (23064)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1000 рублёў

ХОДЗЯЦЬ ЧУТКІ, ШТО...

...з-за недахвату масла яго размяркоўваюць па картках

Некаторыя сродкі масавай інфармацыі нядаўна распаўсюдзілі звесткі, з якіх вынікае, што ў краіне скончыўся дэфіцыт масла. Зразумела, пасля такога паведамлення да ажыятажу — адзін крок. Айчынны спажывец, навучаны ўсім ладам папярэдняга жыцця назапашваць усё ў вялікай колькасці, рэагуе на любы дэфіцыт імгненна. Пайшла нават пагалоска, што ў пэўных рэгіёнах Беларусі гэты прадукт харчавання ўжо размяркоўваецца людзям па картках. Каб удакладніць сітуацыю і пачуць каментарый, як кажуць, з першых вуснаў, карэспандэнт «Звязды» звярнуўся ў Міністэрства гандлю да намесніка міністра Міхаіла Бутухоўскага.

Міхаіл Міхайлавіч на пачатку размовы катэгарычна абверг чуткі аб недахваце як у краіне ў цэлым, так і ў асобных рэгіёнах масла. «Перабояў з маслам сёння няма і быць не можа», — афіцыйна заявіў намеснік міністра. Як было сказана далей, гэты прадукт сёння можна набыць без праблем, скажам, у Мінску, па цане 43-44 тысячы рублёў за кілаграм. У якасці доказу ў прысутнасці журналіста Міхаіл Бутухоўскі патэлефанаваў у некаторыя магазіны горада з пытаннем, ці ёсць у продажы масла. Ва ўсіх магазінах быў атрыманы станоўчы адказ. Толькі адзін раз — у магазіне на вул. Р. Люксембург — адказалі, што некалькі гадзін у гандлёвай зале адсутнічала масла, паколькі ў гэты час яно размарожвалася на складзе. Магчыма, намесніка міністра пазналі па голасе? Для чысціні «эксперымента» журналіст прапанаваў з кабінета накіравацца ў любую гандлёвую кропку сталіцы, каб на свае вочы пераканацца, што ніякага дэфіцыту няма.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ПРОСТЫЯ ЛЮДЗІ ХОЧУЦЬ СПАКОЙНА ЖЫЦЬ І НАРМАЛЬНА ПРАЦАВАЦЬ»

Рабочая паездка Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі ў Маладзечанскі раён, што адбылася 30 кастрычніка, складалася з дзвюх частак. Спачатку ён наведаў эксперыментальную жылую забудову і прадпрыемствы па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, размешчаных пад Маладзечнам. А затым кіраўнік дзяржавы наведаў два прамысловыя аб'екты ў самім горадзе: навукова-вытворчае прадпрыемства «Струм» і вытворчае аб'яднанне «Маладзечнамэбля».

Нарошчванне аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва ў рэспубліцы — адна з асноўных задач прэзідэнцкай праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Апошнім часам кіраўніцтва нашай дзяржавы вывучае некалькі варыянтаў вырашэння гэтай праблемы. У вёсцы Ракуцёўшчына завяршыўся адзін з эксперыментаў, вынікі якога дасканала вывучыў Прэзідэнт.

Расказваючы аб сваіх уражаннях пасля наведвання гэтай вёскі, Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што агляд забудовы быў для яго самым галоўным пунктам у праграме рабочай паездкі. «Я адчуў, што мы знайшлі тое, што шукалі, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Ён значна лепшы за той, што быў рэалізаваны ў Віцебскай вобласці. У Ракуцёўшчыне пабудаваны дамы і для адзінокіх людзей, і для двух чалавек, і іншыя — ёсць з чаго выбіраць. Але самае галоўнае, якасць будаўніцтва кантраляваў канкрэтны чалавек, які быў заказчыкам. І будаўнікі рабілі ўсё па яго жаданню. Вяскоўцы атрымалі для гэтага будаўніцтва крэдыты на 40 гадоў пад 5 працэнтаў, і яны будуць кожны год выплачваць невялікія сумы.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

РОЗГАЛАС

ЭСТАФЕТУ ДАСЯГНЕННЯЎ ТРОХ СТАЛІЧНЫХ АБЛАСЦЕЙ ПЕРАНЯЎ МІНСК

Парад тавараў і паслуг прадпрыемстваў і арганізацый сталічных абласцей Беларусі, Расіі і Украіны адкрыўся 31 кастрычніка ў выставачным комплексе «Мінскэкспа». Гэта ўжо трэцяя сустрэча дзелавых людзей суседніх рэспублік. Першая прайшла ў Мыцішчах пад Масквой, другая — у Броварах каля Кіева.

«Сведчаннем дружбы і магутнасці, а таксама таго, што ніколі нікому не будзе дазволена нас раскідаць па розныя бакі барыкад, з'яўляюцца многія мерапрыемствы, якія ажыццёўлены з удзелам трох вялікіх славянскіх народаў», — сказаў Прэзідэнт рэспублікі Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што цяперашняя выстаўка — гэта чарговае ў гэтым шэрагу магутнае эканамічнае мерапрыемства. Кіраўнік дзяржавы ўважліва азнаёміўся з прадстаўленай тут прадукцыяй. Гэта машыны, абсталяванне і тэхніка, бытавыя тавары і вырабы лёгкай прамысловасці, разнастайныя прадукты харчавання.

Кіраўнік адміністрацыі Кіеўскай вобласці Анатоль Засуха, які прыбыў на выстаўку-кірмаш, зачытаў прывітанне Прэзідэнта Украіны Леаніда Кучмы, дзе таксама гаворыцца аб важнасці мерапрыемства, што праводзіцца ў сталіцы Беларусі. «Дзелавым людзям ёсць з чаго выбраць для падпісання новых дагавораў у мэтах працвітання нашых дзяржаў», — напісана ў пасланні.

Добрым прыкладам для ўсіх брацкіх народаў і краін СНД назваў экспазіцыю старшыня расійскага ўрада Віктар Чарнамырдзін. У яго прывітанні падкрэслена, што такая выстаўка-кірмаш садзейнічае аднаўленню рознабаковых кантактаў у гандлі і эканоміцы, навуцы і тэхніцы. Акрамя таго, садзейнічае абмену духоўным культурным багаццем.

Ва ўрачысты момант адкрыцця экспазіцыі кіраўнік адміністрацыі Маскоўскай вобласці Анатоль Цяжлоў уручыў старшыні Мінскага аблвыканкома Пятру Пётуху ключы ад унікальнага міжгародняга аўтобуса, які выпусціў галіцкі завод сумесна з кампаніяй «Мерседэс-Бенц».

Тэрэза ХАЮЦІНА, БЕЛТА.

КАНЦЛЕР ФРГ — ПРЭЗІДЭНТУ БЕЛАРУСІ

Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Беларусі Готфрыд Альбрэхт па даручэнню федэральнага канцлера Гельмута Коля перадаў Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Лукашэнку падзяку кіраўніка германскага ўрада за віншаванні з нагоды Дня германскага адзінства. «Я ўпэўнены, што добрыя адносіны паміж нашымі краінамі і ў будучыні будуць развівацца і паглыбляцца ў духу супрацоўніцтва і партнёрства», — падкрэсліў пры гэтым Гельмут Коль.

БЕЛТА.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА СУСТРЭЎСЯ З ФІЛАРЭТАМ

31 кастрычніка адбылася сустрэча Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі з Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі, мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам.

Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт праінфармаваў А. Р. Лукашэнку па пытаннях царкоўнага жыцця прыходаў, духоўных школ і перспектывах развіцця міжнародных сувязей Беларускай праваслаўнай царквы. Былі закрануты пытанні будаўніцтва новых храмаў, у тым ліку хутчэйшага аднаўлення гістарычнага помніка XVI ст. Спаса-Праабражэнскай царквы ў горадзе Заслаўі, якая падверглася нядаўна апаганенню і падпалу.

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, на сустрэчы абмяркоўваліся пытанні маючай адбыцца канстытуцыйнай рэформы, а таксама змяненні і дапаўненні, што прапануюцца з боку Царквы для ўнясення ў новую рэдакцыю Асноўнага закона.

Размова прайшла ў духу ўзаемаразумення.

БЕЛТА.

ПРАДПРЫЕМСТВЫ ПАВІННЫ ДУМАЦЬ АБ ЭКСПАРЦЕ

Прынцыповая размова адбылася 31 кастрычніка ў прэм'ер-міністра рэспублікі Міхаіла Чыгіра ў час наведвання ў Пінску завода «Кузлітмаш».

Прааналізаваўшы стан спраў на прадпрыемстве, кіраўнік урада прыйшоў да высновы, што для стабілізацыі становішча яго кіраўніцтву неабходна паклапаціцца аб павелічэнні экспартных паставак. Тым больш, што «Кузлітмаш» апошнім часам актыўна асвойвае рынкі далёкага замежжа, у прыватнасці Індыі, Тайваня і Ганконга. І доля экспарту ў гэтыя краіны складае 25 працэнтаў усёй прадукцыі прадпрыемства. Тым не менш, на думку Міхаіла Чыгіра, 45 мільярдаў рублёў — даход завода за дзевяць месяцаў сёлетняга года — сума мізэрная. Таму што на яго складах асела тавараў амаль на 30 мільярдаў рублёў.

У гэты ж дзень кіраўнік урада наведаў шэраг іншых прадпрыемстваў Піншчыны. На сустрэчах у працоўных калектывах аналізаваліся шляхі выхаду з крызіснай сітуацыі.

Уладзіслаў ПЛАТУН, БЕЛТА.

БАНКАЎСКАЯ ХРОНІКА

Нацыянальны банк накіраваў камерцыйным банкам тэлеграму, у якой гаворыцца аб дазволе на продаж замежнай валюты суб'ектам гаспадарання рэспублікі для пагашэння асноўнага доўгу і працэнтаў па крэдытах у замежнай валюце.

Для гэтых мэтаў банкі могуць без абмежавання сумы выкарыстоўваць замежную валюту, купленую ў насельніцтва, а таксама валюту, набытую на міжбанкаўскім валютным рынку.

Зроблена гэта з мэтай фінансавай стабілізацыі банкаўскага сектара і вырашэння праблемы неплацяжоў.

Алесь МАКОЎСКІ.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

СЁННЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ЗДОЛЕЛІ РАЗЛІЧЫЦЦА З ПРАЦОЎНЫМІ. А ШТО БУДЗЕ ЗАЎТРА?

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Міністэрстве прамысловасці, па папярэдніх падліках, ужо сёння можна гаварыць аб выкананні прэзідэнцкага распараджэння наконт ліквідацыі запазычанасці па заработнай плаце. Спосабы і метадалогія выканання распараджэння кіраўніка дзяржавы — справа іншая.

Дванаццаць беларускіх заводаў і фабрык атрымалі падтрымку дзяржавы — ім быў выдзелены крэдыт у памеры 35,4 мільярда рублёў. Чаму? Таму што падобнай аперацыі не маглі зрабіць банкаўскія ўстановы па прычыне адсутнасці неабходных гарантый. Іншыя кіраўнікі атрымлівалі крэдыт, закладваючы асноўныя фонды: калі не разлічацца, то прадпрыемства пойдзе з малатка. Здараліся нават выпадкі выдачы «харчовых пайкоў»: праз магазіны (раней гэта былі сталы заказаў) працоўныя маглі атрымаць сетку кітайскіх кансерваў ці прыгожую майку з замежнымі надпісамі. Так, адзін мой знаёмы вельмі ганарыўся, што здолеў «набыць» футболку ўсяго за 200 тысяч «зайцоў». «Глядзі, якая добрая рэч», — хваліўся ён мне. Можа яно і так на самай справе, хай лепш будзе майка на плячах, чым заробак праз квартал. Сістэма заводскіх магазінаў (зараз яна налічвае дзесьці каля 70 гандлёвых кропак) мае тэндэнцыю да пашырэння, як паведаміў мне адзін дасведчаны чыноўнік. А што, вельмі зручная сістэма: гані бартэр, разлічвайся з працоўнымі — і галава балець не будзе. Не тое што шукаць «жывыя» грошы ці спаганяць з суседзяў даўгі.

Галоўнае — загад выканаць...

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

НЕРАЗВЕДАНЫЯ РЭСУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ НАФТЫ СКЛАДАЮЦЬ ПРЫКЛАДНА 166 МІЛЬЁНАЎ ТОН

Бліжэйшым часам у Беларусі плануецца значна павялічыць аб'ём геолагаразведвальных работ з тым, каб рэальна ацаніць запасы ўласнай нафты.

Па прагнозах экспертаў, патрэбнасць рэспублікі ў нафце да 2010 года складзе 18 мільёнаў тон. Ацэньваючы варыянты паставак з Расіі, краін Еўропы, Блізкага і Сярэдняга Усходу, эксперты аддаюць перавагу расійскім пастаўшчыкам. Пры гэтым неабходна ведаць і ўласны патэнцыял. Паводле даных Міністэрства паліва і энергетыкі, зараз паказчык забяспечанасці мясцовымі рэсурсамі складае прыкладна 10 працэнтаў ад неабходнага. Усяго ў рэспубліцы здабыта 93 мільёны тон нафты, рэштакавыя запасы складаюць 71 мільён, у той час як неразведаныя рэсурсы ацэньваюцца прыкладна ў 166 мільёнаў тон. У хуткім часе Міністэрства паліва і энергетыкі мяркуе актыўна асвойваць Прыпяцкае нафтагазавае радовішча.

Святлана ЮЗІК, БелаПАН.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Чарговае пленарнае пасяджэнне Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання адбудзецца 5 лістапада 1996 года ў 9 гадзін 30 хвілін у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у Доме ўрада.

КУРСЫ АБМЕНУ НАЯЎНЫХ ВАЛЮТ у камерцыйных банках на 31 кастрычніка 1996 г.

Назва банка	Долар ЗША		Нямецкая марка		Расійскі рубель		Тэлефоны
	Купля	Продаж	Купля	Продаж	Купля	Продаж	
Гал. упр. НБ па Мінску і Мінскай вобл.	20150		13300		3.65		266-441
Ф-л «Мілавіца» АКБ «Мінскі транзітны банк»	20000	20150	13000	13250	3.55	3.65	372-825
Нацыянальны банк РБ (курс для безнаяўных разлікаў)	15000		9917.36		2.75		
Цэнтрабанк Расіі	5455			3609.00	100 бел. р. 25.40		

Інфармацыя прадастаўлена агенцтвам Граўцова.

ВЯДУЧЫЯ ЮРЫСТЫ КРАІНЫ ПЕРАСЦЕРАГАЮЦЬ КАНСТЫТУЦЫЙНЫ СУД, КАБ ЁН НЕ ВЫХОДЗІЎ ЗА МЕЖЫ СВАІХ ПАЎНАМОЦТВАЎ

Як вядома, 1 лістапада адбудзецца пасяджэнне Канстытуцыйнага суда, дзе плануецца разгледзець Пастанову Вярхоўнага Савета ад 6 верасня сёлетняга года «Аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму ў Рэспубліцы Беларусь і мерах па яго забеспячэнню». На пасяджэнне запрошаны міністр юстыцыі Валянцін Сукала, старшыня Вярхоўнага суда Уладзімір Каравай і старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда Уладзімір Бойка. Як стала вядома карэспандэнту БЕЛТА, напярэдадні судовага слухання вышэйназваныя кіраўнікі прававых ведамстваў звярнуліся з пісьмамі на імя старшыні Канстытуцыйнага суда Валерыя Ціхіні, дзе яны выклалі свой пункт гледжання па гэтым пытанні. Галоўныя юрысты краіны выказалі думку, што разгляд гэтай справы выходзіць за межы кампетэнцыі Канстытуцыйнага суда.

ВАЛЯНЦІН СУКАЛА, МІНІСТР ЮСТЫЦЫІ

На думку міністра, у адпаведнасці з заканадаўствам Канстытуцыйны суд мае права па свайму выбару разглядаць пытанні аб адпаведнасці нарматыўных актаў любога дзяржаўнага органа Канстытуцыі і законам рэспублікі, а таксама міжнародна-прававым актам, ратыфікаваным Беларуссю. Разам з тым Валянцін Сукала падкрэслівае, што Вярхоўны Савет да гэтага часу не даў афіцыяльнае тлумачэнне часткі другой артыкула 127 Канстытуцыі, з якога б вынікала, што сам заканадаўца разумее пад нарматыўным (нарматыўна-прававым) актам.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

РАІЦЦА З НАРОДАМ — І ПРАВА, І АБАВЯЗАК ПРЭЗІДЭНТА

Дэлегаты IV справаздачна-выбарнай канферэнцыі Беларускай арганізацыі ветэранаў вайны, працы, Узброеных Сіл і праваахоўных органаў і ветэранскай грамадскасці Рэспублікі Беларусь прынялі зварот да ўсіх ветэранаў краіны.

У звароце гаворыцца, што палітычная абстаноўка ў краіне апошнім часам ускладнілася. Яшчэ больш дэстабілізаваць яе імкнуцца нацыянал-радыкалы, гандлёва-фінансавая буржуазія, карумпаваныя і мафіёзныя колы, іншыя рэакцыйныя сілы. Яны хочуць паглыбіць крызіс у эканоміцы, сацыяльнай і духоўнай сферах і, дзейнічаючы па прынцыпу «чым горш, тым лепш», прыбраць да рук усю паўнату ўлады.

«Падспуднае процістаянне носьбітаў розных поглядаў на рэфарміраванне палітычнай сістэмы дзяржавы і шляху далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь набыло цяпер жорсткі бескампрамісны характар, — адзначаецца ў звароце. — Канкрэтным праяўленнем гэтага стала проціпастаўленне заканадаўчай улады ўладзе выканаўчай, імкненне часткі кіраўніцтва Вярхоўнага Савета і дэпутацкага корпуса дыскрэдытаваць Прэзідэнта, паралізаваць выканаўчую ўладу, ускладніць і без таго цяжкае эканамічнае становішча рэспублікі».

«Ветэраны, а нас больш як 2,5 мільёна, не могуць і не павінны быць абыякавымі да лёсу сваёй Айчыны, да ўсяго таго, што створана працай многіх пакаленняў і абаронена вялікай крывёю ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вось чаму мы цалкам падтрымліваем палітычны курс і сацыяльна-эканамічную праграму Прэзідэнта і адабраем пытанні, якія ён выносіць на рэферэндум. Раіцца з народам — не толькі канстытуцыйнае права, але і абавязак Прэзідэнта. Гэта і выражэнне вышэйшай дэмакратыі. Наш з вамі, дарагія таварышы ветэраны, станоўчы адказ на прапановы Прэзідэнта ў дзень рэферэндуму дапаможа стабілізаваць абстаноўку ў рэспубліцы, павысіць адказнасць усіх галін улады за вырашэнне праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, стварэнне належных умоў для плённай працы беларускага народа, павышэння яго дабрабыту», — гаворыцца ў прынятым звароце.

БЕЛТА.

ДАСЛОЎНА

Сямён ШАРЭЦКІ:

«У нас з Прэзідэнтам розныя погляды на развіццё нашай дзяржавы»

Палітычная сітуацыя ў нашай краіне напярэдадні рэферэндуму застаецца даволі вострай. Некаторым здаецца, што гэта звязана ўсяго толькі з саперніцтвам за ўладу паміж парламентам і Прэзідэнтам, аднак справа не толькі ў гэтым. Тым не менш, адносіны заканадаўчай і выканаўчай галін улады з'яўляюцца вызначальнымі ў нашай сітуацыі.

Таму пункт погляду Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Сямёна Георгіевіча Шарэцкага на палітычныя праблемы нашай дзяржавы з'яўляецца надзвычай важным і вартым увагі нашага грамадства.

— Сямён Георгіевіч, ці лічыце вы кампрамісам той факт, што Прэзідэнт згадзіўся на правядзенне рэферэндуму 24 лістапада?

— Вы ведаеце, а чаму ён павінен быў не згадзіцца? Калі б ён не згадзіўся, то парушыў бы закон, Канстытуцыю. З якога часу выкананне Канстытуцыі пачало лічыцца кампрамісам? Прэзідэнт правільна зрабіў, што пагадзіўся з рашэннем Вярхоўнага Савета, але ніякага кампрамісу тут не было.

— Ці лічыце вы гэта поспехам Вярхоўнага Савета?

— Я не хацеў бы менавіта так акцэнтаваць увагу. Вярхоўны Савет абавязаны весці барацьбу за выкананне Канстытуцыі ўсімі галінамі ўлады.

— Тым не менш, сітуацыя з рэферэндумам застаецца пакуль не да канца пэўнай. Асабіста вы звярнуліся ў Канстытуцыйны суд з просьбай разгледзець абодва варыянты Канстытуцыі, вынесеныя на рэферэндум. Ці не лічыце вы, што правільней было б гэта зрабіць да прыняцця адпаведнай пастановы парламента?

— Так, я звярнуўся ў Канстытуцыйны суд, я гэта абавязаны быў зрабіць як Старшыня Вярхоўнага Савета. Але справа ў тым, што свой праект змяненняў і дапаўненняў (ці новую рэдакцыю Канстытуцыі) Прэзідэнт даў у самы апошні час, калі мы далей не маглі адцягваць разгляд пытання аб рэферэндуме. Калі б ён даў яго своечасова, дык было б так, як вы кажаце: я адразу аддаў бы яго ў Канстытуцыйны суд, а пасля прымалі б пастанову. А так я павінен быў зрабіць і тое і другое адначасова.

— Ці абвострыцца, на ваш погляд, палітычная сітуацыя ў Беларусі пасля прыняцця КС адмоўнага або станоўчага рашэння па гэтым пытанні? Некалькі дзён таму на сустрэчы з ветэранамі А.Лукашэнка заявіў, што калі КС прызнае, што пастанова парламента аб правядзенні рэферэндуму была неканстытуцыйнай, то ён у сувязі з гэтым, карыстаючыся чацвёртым пунктам леташняга рэферэндуму, пойдзе на роспуск Вярхоўнага Савета...

— Канстытуцыйны суд не прызнае, што рашэнне парламента было неканстытуцыйным, яно было менавіта канстытуцыйным, тут Прэзідэнт гаворыць няпраўду. КС павінен толькі вынесці сваё заключэнне, ці з'яўляюцца прапанаваныя на рэферэндум тэксты Канстытуцыі змяненнямі і дапаўненнямі, ці гэта праекты новай Канстытуцыі. Гэта датычыцца не толькі прэзідэнцкага праекта, але і праекта змяненняў і дапаўненняў, прапанаванага дэпутатамі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Думы мае да Дзядоў даплываюць аблочна

Спеце ўсе тыя, што праўды на свеце шукалі
І, не здабыўшы, у дамоўкі без часу сышлі...

Янка КУПАЛА

1909 г.

I.

Думаў маіх пералётныя лёгкія птахі зноў заспяшалі роднае хаты ў вырай. Зноў журавінавы Край мой залоціць-самоціць дзівосніца-восень. І чарада маіх думаў прысела на покуці цёплай расстайна, праменна. Думаў маіх жураўліных крылатую прагу не наталіла дарога зямная, — раскрыжаваліся думы над восеньскім небам ахвярна. Думы мае, як лістота, ляцяць і знікаюць. Я прыручыць іх памкнулася, выткаць аснову, у прыгаршчу ссыпаць праменне.

Думы мае да Дзядоў даплываюць аблочна, сцярожка — і павяртаюць Зямлі нездранцвелую памяць. Думы мае прывялі мяне зноў да Купалы — на споведзь.

... Свечкі пялёстак гарачы трапечацца сумна ў прысадак. Вокны Купалавай хаты глядзяць на мяне прыцягальна-ўтрапёна, быццам да вечнасці клічуць — у восеньскай цішы згубіцца. Дотыкам душаў з Дзядамі зладуем вячэру — помных, забытых, чужых і радзімных згадаем. Хата Купалава, бачу, распраствае плечы: можа, радзімным гняздом сябе тут, на сядзібе, адчула. Той жа хаціны, што ведала Янкавы крокі і ўздыхі, болей няма на планеце — вайна спапяліла. А на пажарышчы ўзвысіўся думаў прытулак і вершаў-прычасцяў. Ведаю, веру: зямля не забылася поступ трывожны паэтаў.

Шле ліставанні дагэтуль старая таполя — да ваканіцаў прымружаных лісце пяшчотна спадае. Жаліцца? Плача? Замольвае нашыя лёсы людскія ад халадэчы нягодаў і вогніку здрады?

Я да зямлі прыпадаю адчайна, люботна, балесна. Слухаю тупат: Пагоні, ваярскае песні галоссе і мройную цішу. Ганак, як прывід, у цемраве хісткім, бялее. Быццам карэнне вякоў прамінулых, да продкаў прыступкі... Лесвіцы, лесвіцы — сцежкі, гасцінцы, узлёты й адлёты... Лесвіцы жыццяў, сягненняў, бязвер'я і веры. Лесвіцы пошукаў нашых у Космасе душаў.

Божа мой, Божа, нашто ты абрынуў Купалу ў той непраглядны пралёт, што палохаў і мучыў, балеў усяночна-гаркотна?

Птахамі з неба ляцелі, любоў выкрасаючы ў свеце, нашы паэты да долу, да траваў, да росаў. Птахамі ў неба пайшлі, каб дарогі не стылі — віліся ў бясконцасць. Сталі Дзядамі. Сівымі Дзядамі над намі, над нашай сіроцкаю доляй. Існасцю сталі, бо тут не згубілі вытоку.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Калектыву Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута

Сардэчна віншую прафесарска-выкладчыцкі састаў, аспірантаў, студэнтаў, усіх работнікаў Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута ў сувязі з 75-годдзем з дня яго заснавання.

На ўсіх этапах сваёй гісторыі Мінскі медыцынскі інстытут выконваў і выконвае ролю вядучага навукова-практычнага цэнтра па падрыхтоўцы ўрачоў, якія прадстаўляюць самую мірную і гуманную прафесію на зямлі. Пераважная большасць спецыялістаў у сістэме аховы здароўя рэспублікі з'яўляюцца выпускнікамі вашай навучальнай установы. Шырокае прызнанне дасягненняў беларускай медыцыны — вышэйшая ацэнка плённай работы інстытута.

Шчыра жадаю ўсяму калектыву Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута далейшых поспехаў у справе падрыхтоўкі спецыялістаў, якія выконваюць у грамадстве высакародную місію.

Новых вам здзяйсненняў, здароўя і шчасця.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

СПІКЕР ПАРЛАМЕНТА АДБЫЎ У ПЕЦЯРБУРГ

31 кастрычніка Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Сямён Шарэцкі адбыў у Пецярбург, дзе прыме ўдзел у 8-м пленарным пасяджэнні Міжпарламенцкай асамблеі.

Чарговая сустрэча кіраўнікоў вышэйшых заканадаўчых органаў краін Садружнасці прымеркавана да пятай гадавіны ўтварэння СНД. Яе ўдзельнікі абмяняюцца думкамі па пытаннях заканадаўчага забеспячэння рэформаў, якія праводзяцца ў дзяржавах Садружнасці, а таксама прапановамі аб далейшай дзейнасці МПА па паглыбленню інтэграцыйных працэсаў.

Чакаецца, што з дакладам на пленарным пасяджэнні выступіць кіраўнік беларускага парламента. Сямён Шарэцкі праанализуе ролю парламентаў незалежных дзяржаў у станаўленні і далейшым развіцці Садружнасці. Выступаючы за больш глыбокую інтэграцыю як у рамках СНД, так і на двухбаковай аснове, Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі мае намер выказаць свой пункт гледжання на галоўную мэту аб'яднальных працэсаў. На яго думку, для таго, каб грамадзяне дзяржаў Садружнасці не адчувалі сябе бежанцамі ў сваіх краінах, заканадаўцы павінны засяродзіць увагу на дасягненні чатырох галоўных свабод: свабоды перамяшчэння людзей, тавараў, капіталаў і паслуг.

Ларыса ЛАЗАР, БЕЛТА.

Паважаныя чытачы газеты «Звязда»!

Нагадваем вам, што працягваецца падпіска на 1997 год, год, у якім мы разам з вамі адзначым 80-годдзе старэйшай беларускай газеты. Мы разумеем, што ў сённяшняй складанай сітуацыі цяжка знайсці лішнія грошы на падпіску, але, паверце, «Звязда» не будзе лішняй у вашым доме. Мы даём вам галоўнае — інфармацыю.

Падпіску можна аформіць на паўгода (тады, праслаўшы спецыяльны купон, вы зможаце стаць удзельнікам латарэі, галоўны прыз якой — конь з вупражжу). Кошт падпіскі на першае паўгоддзе — **83.400 рублёў.**

Падпіску можна аформіць і на тры месяцы **(41.700 рублёў).** *Удзельнікі латарэі могуць выйграць тавары народнага спажывання, сярод якіх электраплуг, веласіпеды, тэлевізары, пральныя машыны, фотаапараты, люстры і г.д.*

Нагадваем, што **спецыяльны конкурс праводзіцца і для паштальёнаў,** для якіх таксама ўстаноўлены каштоўныя прызы: тэлевізар, пральная машына «Мара», веласіпед.

Будзем разам!

«У НАС З ПРЭЗІДЭНТАМ РОЗНЫЯ ПОГЛЯДЫ НА РАЗВІЦЦЁ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Таму і размовы пра роспуск ВС не можа быць?

— Я не ведаю, нашаму ж Прэзідэнту ўсё дазволена, ён можа абвінаваціць парламент, нібыта дэпутаты прызначылі сабе пенсію ў 35 гадоў у памеры 2 мільёны. Такой пастановы ён не мог і бачыць, бо яе няма. Таксама ён хлусіў, што нібыта галасавалі супраць ратыфікацыі Белавежскіх пагадненняў, а гэта ж было не так...

— Тым не менш, вы лічыце, што пасля рашэння Канстытуцыйнага суда палітычная сітуацыя ў Беларусі захаваецца ў прававым рэчышчы?

— Мы ўсё будзем рабіць, каб было так. Прытым, калі Канстытуцыйны суд прызнае праекты Прэзідэнта і дэпутатаў новымі канстытуцыямі, то мы звернемся да [illegible], каб яны адклікалі свае праекты з рэферэндуму. Вярхоўны Савет будзе стаяць на абароне Канстытуцыі.

— А як складваюцца цяпер вашы асабістыя адносіны з А. Лукашэнкам?

— Што ж, мы некалі суседзямі былі, [illegible]. У нас розныя погляды на развіццё дзяржавы. [illegible] не Прэзідэнт, а ўрад, які абавязаны падпарадкоўвацца і адказваць перад людзьмі, і ў прыватнасці перад парламентам. А Прэзідэнт павінен стаяць на чале дзяржавы, але не на чале выканаўчай улады.

— Але ў праекце камуністаў і аграрыяў прапануецца скасаванне пасады Прэзідэнта ўвогуле.

— Так, але я ўжо выказваўся, што не пагаджаюся ў нейкіх пэўных момантах і з гэтым праектам.

— Хіба вы мяркуеце, што Вярхоўны Савет мог бы пайсці на той кампраміс, да якога яго заклікаў Усебеларускі народны сход, — аб адкліканні альтэрнатыўных пытанняў?

— А чаму яны адзін бок заклікаюць да адклікання пытанняў, а другі — не? І Прэзідэнт, і парламентары, паводле Канстытуцыі, маюць права выносіць свае пытанні на рэферэндум.

— Ці не давялося вам пашкадаваць, што ў сваім артыкуле пра фашызм у Беларусі вы выступілі вельмі жорстка?

— Наадварот, кожны дзень пацвярджае, што я меў рацыю. Хіба штонебудзь палепшылася ў тых жа сродках масавай інфармацыі? А як [illegible]ваеце, што ў нас на 10,5 мільёна жыхароў Беларусі 125 тысяч асабовага саставу міліцыі? Вось я гаварыў нядаўна з кіраўніком польскага Сейма панам Юзафам Зыхам, і ў іх на 40 мільёнаў насельніцтва толькі каля 100 тысяч паліцэйскіх. Гэта ж гаворыць аб тым, што наша дзяржава ўжо паліцэйская. А [illegible] з вуснаў Прэзідэнта метады працы? Гэта [illegible] таталітарнай дзяржавы, таго кіраўніцтва. Больш таго, у сваім артыкуле я прыводзіў словы [illegible] Лукашэнкі пра рэжым [illegible], які яму падабаецца...

— А ў цэлым, Сямён Георгіевіч, хацелася б пачуць вашы ацэнкі, якой бы вы хацелі б бачыць нашу дзяржаву і чаго вы асцерагаецеся ў развіцці палітычнай сітуацыі ў Беларусі?

— Я хацеў бы бачыць развіццё Беларусі па дэмакратычным шляху, як развіваецца Чэхія, напрыклад, там ёсць і Прэзідэнт, там ёсць і парламент, там ідуць рэформы, устанаўліваюцца рынкавыя адносіны... Я не хацеў бы таго, што цяпер у нас робіцца і што можа быць, калі, не дай Бог, будзе прыняты праект Канстытуцыі Прэзідэнта. Тады будзе ў нас таталітарная дзяржава з усімі яе вынікамі, трэба будзе прыбаўляць не толькі міліцыі, але і турмаў... Гэта вельмі небяспечна, таму я і звярнуўся да людзей.

— Але ці ўсе разумеюць гэта менавіта так — людзі, кіраўнікі, дэпутаты?

— Я думаю, што не ўсе гэта разумеюць. Больш таго, нехта разумее, але баіцца выказаць. Мне адзін з дэпутатаў, які актыўна падтрымлівае Прэзідэнта, казаў: калі б мы ведалі, што яго не будзе тры-чатыры месяцы, то ўсе пабеглі б. Баяцца людзі. Кожны на нейкай рабоце. Каб дэпутаты былі ўласнікамі нейкіх заводаў ці майстэрняў, ці былі б фермерамі, уласнікамі кааператыўнай маёмасці, то яны б не баяліся. Чаму Леў Талстой выступаў з пратэстам і пісаў цару: «Не магу маўчаць»? Ды таму, што ў яго маёнтак быў, Ясная Паляна, які яго карміў хлебам. А ў нас звольні таго ж дэпутата з дзяржаўнага прадпрыемства, дык з торбаю пойдзе, таму і [illegible].

— Ці лічыце вы слушным, што ў беларускія справы апошнім часам актыўна ўмешваюцца расійскія палітыкі — Лебедзь, Зюганаў, Чарнамырдзін? Ці не мяркуеце вы, што беларусамі правакуюць і заклікаюць іх да гэтага?

— Нахабна ўмешваюцца з аднаго боку, такія дзеячы, як Лебедзь, Тулееў, Жырыноўскі. Але я не сказаў бы, што кіраўніцтва Расіі нахабна ўмешваецца ў нашы ўнутраныя справы. Яны занепакоены тым, што адбываецца ў Беларусі, [illegible] не выказваюцца, за каго [illegible] галасаваць. Я думаю, што [illegible]ны неяк уздзейнічаць, таму што мы ў адным Супольніцтве, і гэта адбіваецца і на нашай [illegible] на эканоміцы.

— Вы лічыце, што гэта [illegible] кіраўніцтва Расіі спры[illegible]?

— Я думаю, што так, [illegible] клікаюць, каб ніхто не [illegible] канстытуцыйнага поля, каб [illegible] білася ў рамках заканад[illegible]. Хі[illegible]ба ж гэта кепска? А за[illegible] А. Тулеева накіраваны на ўмяшанне ва ўнутраныя справы, і ў іх зацікаўлены прэзідэнцкі бок, вы ж памятаеце, хто прадстаўляў таго Тулеева?

— Але ж і вы самі часта бываеце ў Расіі, сустракаецеся там з лідэрамі расійскай палітыкі. [illegible]

[illegible]

тах? Калі рабіць гэта, тады прыйдзецца стаць з ім на адзін узровень...

— Чаму ўсё-такі так атрымліваецца, што і дэпутаты як быццам ашукваюць Прэзідэнта: спачатку згаджаюцца на яго патрабаванні, падпісваюцца, а потым галасуюць інакш, асабліва ў кабінках для тайнага галасавання? Як было апошні раз, калі падпісаліся 110 дэпутатаў, а прагаласавалі толькі 84.

— Таму што астатнім «выкручвалі» рукі, прымушалі іх падпісацца [illegible]нам, а калі людзі [illegible], то гэта ўсё [illegible]. [illegible] выпадкі вядомы.

— Як вы паставіліся да заявы [illegible] Ю. Малумава аб адстаўцы?

— [illegible] галасаванне [illegible] прыйшоў у Вярхоўны Савет [illegible] нечую лінію, [illegible] законы, і калі [illegible] ён хоча сысці, [illegible].

— [illegible] нядаўнюю ад[illegible] у ВС Дзяржтэлерадыёкампаніі дзейснай [illegible] больш аб'ек[illegible] праблемы за[illegible] і менш дэз[illegible]насельніцтва?

— [illegible] гэтае рашэнне, [illegible], што той чалавек [illegible] павінен быць [illegible]дзячы ў іншым [illegible] парламент усё [illegible].

— [illegible] перагледжана гэтае рашэнне, пры якіх [illegible]?

— [illegible] Дзяржтэлерадыёкампанія [illegible] ў звычайным [illegible] гэта робяць.

— [illegible] пытанне па СМІ. Як вы мяркуеце, ці павінен ВС пайсці насустрач жаданню калектыву «Народнай газеты» і дазволіць яе акцыяніраванне? Як ВС можа [illegible] «НГ»?

— [illegible] Савет усё робіць [illegible] «Народнай газеты», не [illegible]. Так, гэтая газета ад нас была гвалтоўна адабрана, прычым, зноў-такі, з дапамогай хлусні, фальсіфікацый. Парламент вынес сваё рашэнне, і цяпер справа за пракуратурай. Што датычыць акцыяніравання, то я зазначыў бы, што калі такое пытанне ёсць у калектыву, то трэба ісці насустрач, улічваць яго інтарэсы.

— Як аднаго з лідэраў аграрнай партыі я хацеў бы ў вас спытаць наступнае. У кампартыі ў сувязі з апошнімі падзеямі не спыняюцца скандалы і расколы. Чаму ў аграрнай партыі, члены якой не менш, чым камуністы, залежныя ад уладаў на месцах, не адбываецца такога ж расколу? Маналітнасць аграрыяў для многіх з'яўляецца палітычнай загадкай.

— Справа ў тым, што ў аграрнай партыі няма функцыянераў. У камуністаў да расколаў вядуць прадстаўнікі былой наменклатуры, якая прывыкла падтрымліваць таго, хто наверсе. Таго ж Сакалова я бачыў на XIX партканферэнцыі, калі ён падтрымліваў Гарбачова, прычым за сябе і за ўсю беларускую партарганізацыю. Мяне ён не пытаўся, падзяляю я гэтую думку ці не. А я ўжо тады не падзяляў. У час выбараў яны ж падтрымлівалі не свайго кандыдата, а наменклатуршчыка Кебіча, цяпер падтрымліваюць Лукашэнку... У нас жа няма такіх людзей, якія елі б хлеб за тое, што падтрымліваюць вярхі.

— Вы сустракаецеся з выбаршчыкамі, працоўнымі калектывамі, якую рэакцыю выказваюць яны на вашу дзейнасць?

— Калі прыходзіш на які-небудзь сход, дык там адна рэакцыя, бо туды прыводзяць людзей, якія падтрымліваюць наменклатуру... А вось я быў на кірмашы ў Навагрудку, проста пахадзіў там паміж людзей без усякай аховы, пагаварыў. Гэта было зусім іншае.

— Вы лічыце, што ваша пазіцыя мае сур'ёзную падтрымку?

— Так, і бачу, што з кожным днём усё больш і больш людзей падтрымлівае яе. Мы ўсё будзем рабіць, каб людзі ведалі, што Вярхоўны Савет у сваёй большасці выступае за тое, каб выконваліся законы і каб Канстытуцыя дзейнічала.

— Які ўвогуле ваш настрой?

— На працу.

Размаўляў Валер КАЛІНОЎСКІ.

«ПРАМАЯ ЛІНІЯ»

Уладзімір ГАНЧАРЫК:
«Пакуль наша эканоміка будзе працаваць так, як зараз, чакаць нейкага прасвету нельга»



Прафсаюзы. Паводле статыстыкі, зараз яны аб'ядноўваюць больш як 4,6 мільёна нашых суайчыннікаў. Але што ўяўляюць сабой прафсаюзы сёння? Ці здолелі яны ператварыцца ў сапраўдных абаронцаў інтарэсаў працоўнага чалавека? Урэшце, чым могуць дапамагчы прафсаюзы кожнаму з нас?

Прызнаемся шчыра: паралельна з «прамой лініяй» са старшынёй Федэрацыі прафсаюзаў, дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Уладзімірам Іванавічам Ганчарыкам «Звязда» мела намер правесці своеасаблівае «сацыялагічнае даследаванне» па гэтых пытаннях. Аднак у выніку атрымалася, што ўсе сумненні былі дарэмнымі — да прафсаюзаў па-ранейшаму неабыякавыя. Аб гэтым засведчылі стосы лістоў і дзесяткі званкоў з Віцебска і Ліды, Салігорска і Івацэвічаў, іншых куткоў нашай Беларусі. Прыходзілі ў рэдакцыю і сапраўдныя дэлегацыі. Зрэшты, аб усім па парадку.

«ШТО ПРАФСАЮЗЫ РОБЯЦЬ, КАБ..?»

Здавалася, што, як звычайна, звяртацца да старшыні Федэрацыі прафсаюзаў чытачы будуць толькі са сваімі асабістымі праблемамі. І хаця такога кшталту зваротаў аказалася амаль палова ад усіх, мы ўсё ж памыліліся. Пытанняў, якія датычыліся эканамічнай сітуацыі ў краіне, нашых агульных сацыяльных праблем, дзейнасці прафсаюзаў, таксама было шмат.

— Дзень добры, гэта турбуе вас Лявонцій Мікалаевіч Малец. Вельмі непакоіць сітуацыя на рынку працы краіны. У кастрычніку колькасць беспрацоўных перавысіла 185 тысяч чалавек. Наколькі мне вядома, да гэтай мяжы планавалася падысці толькі напрыканцы года. Па некаторых ацэнках, скрытае беспрацоўе налічвае больш за паўмільёна чалавек. Відавочна, што праблема не вырашаецца, што тактыка захавання працоўных калектываў любой цаной сябе не апраўдвае. А што наконт гэтага мяркуюць прафсаюзы?

— Так, зараз толькі афіцыяльна зарэгістраванае беспрацоўе складае 3,9 працэнта ад усяго эканамічна актыўнага насельніцтва Беларусі. Калі ўлічыць прастоі, няпоўны працоўны час, можна зрабіць выснову, што так званае «скрытае беспрацоўе» знаходзіцца на ўзроўні 21-22 працэнтаў. Вы, Лявонцій Мікалаевіч, маеце рацыю: пры цяперашніх адносінах да праблемы выйсця не бачна. Таму прафсаюзы выступаюць за больш рацыянальны шлях. Сапраўды, нам не трэба любой цаной захоўваць тыя працоўныя месцы, якія свае аджылі. Рана ці позна, але людзі ўсё роўна будуць вымушаны іх пакінуць. Вось чаму мы лічым, што замест гэтага дзяржава перш-наперш павінна клапаціцца аб стварэнні новых, жыццяздольных працоўных месцаў. Толькі тады будзе нейкая перспектыва.

— Гэта Яўген Бароўскі, студэнт БДУ. Уладзімір Іванавіч, як вядома, цяперашні сацыяльна-эканамічны крызіс вельмі балюча адбіўся на моладзі. Што робіць Федэрацыя прафсаюзаў, каб падтрымаць менавіта моладзь?

— Пакуль наша эканоміка будзе працаваць як зараз, пакуль мы не зменім падыходы да яе, пакуль мы не створым умовы для работы прадпрыемстваў, чакаць нейкага прасвету нельга. Бо толькі тады мы атрымаем бюджэт і зможам весці сур'ёзную гаворку пра павышэнне стыпендый, пенсій, дапамог. Толькі тады будзе выконвацца ўказ аб гарантаванні маладому спецыялісту права на першае працоўнае месца.

Але гэта зусім не азначае, што сёння прафсаюзы будуць заставацца ўбаку. Днямі пройдзе Нацыянальны савет па працоўных і сацыяльных пытаннях (у яго ўваходзяць прадстаўнікі ўрада, наймальнікі і прафсаюзы), на якім мы разгледзім Генеральнае пагадненне на 1997 год. У гэтым пагадненні мы плануем зрабіць запіс аб павелічэнні ўзроўню мінімальнай заработнай платы (і, адпаведна, стыпендый), аб забеспячэнні студэнтаў інтэрнатамі, аб ільготнай плаце за іх і г. д.

— Зараз «спажывецкая карзіна» ацэньваецца ў 1 мільён 102 тысячы рублёў, а ў нас на Асіповіцкім заводзе аўтамабільных агрэгатаў выплачваюць толькі так званы мінімальны спажывецкі бюджэт — 638 тысяч. Хіба можна пражыць на такія грошы?

Мікалай Віктаравіч Манетаў, Асіповічы.

— 11 верасня ўдзельнічаў у сходзе прадстаўнікоў прамысловых прадпрыемстваў, дзе мы прагаласавалі за павышэнне мінімальнай зарплаты і тарыфнай стаўкі першага разраду прынамсі на 25 працэнтаў. Ці павысяцца нашы заробкі? Што робяць дзеля гэтага прафсаюзы?

Дзмітрый Максімаў, Мінск.

— Ужо з'явіліся некалькі ўказаў Прэзідэнта аб мерах па фінансава-эканамічнаму аздараўленню, па выплаце заробкаў, па рэалізацыі прадукцыі і г. д. Такім чынам, частка пытанняў, ад якіх напрамую залежаць заробкі на канкрэтных прадпрыемствах, вырашаецца. На жаль, не ўдалося дамовіцца з урадам аб галоўным — аб павелічэнні мінімальнай зарплаты.

Пакуль гэта праблема застаецца, яна будзе тэмай далейшых перамоў па Генеральнаму пагадненню. Магу толькі запэўніць, што ў дадзеным выпадку прафсаюзы настроены рашуча.

— Ці задаволены вы як старшыня Федэрацыі прафсаюзаў выкананнем Генеральнага пагаднення ў гэтым годзе?

Андрэй Грыгаровіч, Лагойск.

— Адназначна — не. Сёння не выконваюцца такія важныя пазіцыі, як аплата працы, суадносіны паміж мінімальным спажывецкім бюджэтам і тарыфнай стаўкай першага разраду, нарэшце, прафсаюзы не атрымалі належных грошай на арганізацыю аздараўлення, культуру, спорт і г. д. Словам, падставы для нездаволенасці ёсць.

Праўда, крыху палепшыліся справы з запазычанасцю па зарплаце. Калі нядаўна ў цэлым па рэспубліцы яна набліжалася да 1 трыльёна рублёў, то на 20 кастрычніка зменшылася да 339 млрд., прычым 324 млрд. з іх — гэта запазычанасць за апошні месяц. Аднак залішне радавацца ўсё ж не варта. На жаль, змяншэнне запазычанасці па зарплаце не стала вынікам работы прадпрыемстваў. Тут прычына іншая — крэдыты. Таму ў хуткім часе становішча можа аказацца яшчэ горшым, чым было.

Сяргей ГРЫБ.

(Заканчэнне будзе.)

У КАБІНЕЦЕ МІНІСТРАЎ

НА ГУМАНІТАРНУЮ ДАПАМОГУ ЗБОРЫ ЗНІМАЮЦЦА

Рэчы, якія паступаюць у Беларусь па лініі гуманітарнай дапамогі або прызначаныя для дабрачынных мэтаў, цяпер не будуць абкладацца мытнымі плацяжамі і падаткам на дабаўленую вартасць. Прыняўшы ў канцы кастрычніка ў сувязі з гэтым спецыяльную пастанову, Кабінет Міністраў таксама вызначыў, што пад гуманітарнай дапамогай трэба разумець тавары, якія бязвыплатна паступаюць ад нерэзідэнтаў рэспублікі і не прызначаны для атрымання камерцыйнай выгады як адпраўшчыкам, так і атрымальнікам. Пры гэтым незалежна ад краіны, што пастаўляе іх, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам або міжнароднымі дагаворамі нашай дзяржавы.

Мытныя плацяжы па-ранейшаму будуць спаганяцца з падакцызных тавараў, акрамя спецыяльных транспартных сродкаў грамадскага карыстання, для патрэб хуткай і медыцынскай дапамогі, пажарнай аховы, органаў унутраных спраў, а таксама прызначаныя для выкарыстання ў адукацыйных, рэабілітацыйных, аздараўленчых, сацыяльных установах і арганізацыях.

Згодна з дакументам, парадак мытнага афармлення рэчаў гуманітарнай дапамогі, якія ўвозяцца на нашу тэрыторыю, устанаўліваецца Дзяржаўным мытным камітэтам рэспублікі. А прыярытэтнымі атрымальнікамі яе з'яўляюцца дзіцячыя дамы, школы-інтэрнаты, іншыя дзіцячыя навучальна-выхаваўчыя ўстановы, дамы і тэрытарыяльныя цэнтры састарэлых і інвалідаў, медыка-сацыяльныя і рэабілітацыйныя цэнтры, цэнтры міласэрнасці, бальніцы і іншыя лячэбна-прафілактычныя ўстановы.

БЕЛТА.

ШТО ВІНЕН, АДДАЦЬ ПАВІНЕН

Мяркуючы па матэрыялах пасяджэння калегіі Кабінета Міністраў, якое адбылося 29 кастрычніка, ісціну аб тым, што калі вінен, аддаць павінен, засвоілі далёка не ўсе кіраўнікі вытворчых прадпрыемстваў краіны. Атрымаўшы замежныя крэдыты пад гарантыі ўрада, яны не спяшаюцца іх вяртаць. У выніку праблема неплацяжоў у Беларусі набыла маштабны характар. Калі ў 1994 годзе на пагашэнне пратэрмінаванай запазычанасці прыпадала 5,6 працэнта бюджэтных сродкаў, то за 9 месяцаў сёлетняга года — ажно 73 працэнты, або 34,6 мільёна долараў.

Асабліва «грашаць» прадпрыемствы сістэмы міністэрстваў сельскай гаспадаркі і харчавання, архітэктуры і будаўніцтва, канцэрнаў «Беллегпром», «Белхімнафтапром». Больш таго, абсталяванне, купленае за валюту, гадамі прастойвае ва ўпакоўцы. У выніку — устарэласць, а з-за нізкага попыту на прадукцыю або недазагрузкі вытворчых магутнасцей яно аказваецца проста непатрэбным. Не ведаюць цяпер, куды яго дзець на Мінскім камвольным камбінаце, некаторых прадпрыемствах Мінсельгасхарчу, Мінбудархітэктуры. Фактычна грошы, узятыя ў рамках крэдытнай лініі Германіі, самастойна плацяць толькі Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод і Беларуская чыгунка.

Каб урэгуляваць разлікі з прадпрыемствамі-пазычальнікамі, урадам прымаліся рашэнні па заключэнню імі дагавораў з Міністэрствам фінансаў аб адтэрміноўцы плацяжоў на 2-3 гады з выплатай васьмі працэнтаў гадавых. І такіх пагадненняў падпісана ўжо больш чым на 40 мільёнаў амерыканскіх долараў.

Каб не ўскладняць узаемаадносіны рэспублікі з міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі і іншымі дзяржавамі, а таксама далейшае напаўненне крэдытных ліній і прыток інвестыцый, прынята спецыяльнае рашэнне.

Міхаіл ЖУРАВОВІЧ, БЕЛТА.

ДУМАЙ, НАРОД, ДУМАЙ!

НЕ ПАТАПІЦЬ БЫ НАМ НАШАГА ПРЭЗІДЭНТА Ў МОРЫ ХІТРАСЦІ І ЛІСЛІВАСЦІ

У чым мы не ведаем недахвату апошнім часам, дык гэта ў палітычных страсцях. Прарвала. Што ў рукі друкаванае ні вазьмі, які канал ці радыёхвалю ні злаві — усюды адно і тое ж — гвалт: «Лукашэнка меціць у дыктатары... Сказаў Шарэцкі... Сказаў Калякін з Новікавым... Фашызм на парозе... Трэба праводзіць рэферэндум... Не патрэбна новая Канстытуцыя і старой зусім дастаткова...»

Так і падмывае спытаць рэжысёраў распачатага палітычнага шоу: «З якой нагоды шум, спадары шаноўныя?» Рытарычнае, вядома, пытанне. Прычына аўтару вядомая, пра яе ніжэй. А вось многія з суграмадзян, усё больш пераконваюся, яе, на жаль, не бачаць: «Правільна ўсе гавораць: падмануў Лукашэнка». І тут жа ўслед аргументы падману: «Расце беспрацоўе, затрымкі з выплатай пенсій, зашкальвае валютны курс...»

Я не люблю, калі змешваюць разам кроў, зямлю, бруд і цукар. І асабліва, калі замест сур'ёзнага аналізу сітуацыі, асэнсавання першапрычын тых ці іншых праблем мне ў якасці важкага аргумента дэманструюць толькі пустыя, выкручаныя навыварат кішэні: «Вось не звініць, і ўсё».

Нікольki не сумняваюся, што, калі б у кішэнях зазвінела, апаненты падобнага роду тут жа расплыліся б ва ўсмешцы: «Улада што трэба! З Рыгоравічам хоць у ваду, хоць у агонь».

Прабачце, але мне асабіста з такімі людзьмі сумна, з такімі, прабачце, не ўзнікае нават жадання ісці да бліжэйшага піўбара. Больш імпануюць аналітыкі, людзі, якія судзяць свайго Прэзідэнта строга, але аб'ектыўна, не робячы з яго куміра, нягледзячы на ўсёмагутнага ідала-чараўніка. Такія, хто душой перажывае ў першую чаргу за лёс сваёй дзяржавы, будучыню сваіх дзяцей, а не за неадкладнае напаўненне кішэняў любой цаной, праз «не магу», хто ў думках ужо не аднойчы пасядзеў на «троне імператара Лукашэнкі». З такімі цікава спрачацца. Яны хоць бы бачыць, адкуль і чые вушы тырчаць у так званым крызісе ўлады.

Галоўная прычына «шуму» — Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўпарта ўвасабляе ў жыццё абяцанні, дадзеныя свайму народу. Ён аказаўся чалавекам справы, што на такіх вышынях — вялікая рэдкасць, чалавекам гонару і сумлення. Прэзідэнт наш гэта пераканаўча даказаў і няспынна працягвае даказваць. Яшчэ год-два, разумеюць выдатна дырыжоры развалу Саюза і навязаных нам рэформаў, і тады яго ніякім імпічментам не возьмеш: любімец народа — сур'ёзна і небяспечна, і што самае страшнае — малады, значыцца не хутка пойдзе; гэта як костка ўпоперак горла. Лёгка сказаць, без адзінага выстралу паў Варшаўскі дагавор, на 80 працэнтаў план «Барбароса-2» рэалізаваны, усе сатэліты Захаду з СНД моўчкі глядзяць у рот заакіянскаму дзядзьку (хоць сёння садзі сваіх марыянетак), а тут, разумееш, раптам нейкі непаслухмяны Прэзідэнт, нейкай суверэннай Беларусі. І вокам не паспееш міргнуць, як на праслаўленай «белавежскай тройцай» зямлі пусціць карані новы Саюз — магутная славянская дзяржава.

Хіба не так? Паглядзіце на суседку-Расію. Па-мойму, каментарыі не патрэбны. Людзі працуюць бясплатна (патрыёты!), сямібаяршчыне да масавых галадовак ніякай справы, тут толькі б дагадзіць заходнім павадырам ды своечасова ўключыцца ў новую, знясільваючую для казны перадвыбарную прэзідэнцкую гонку.

А Украіна, дзе ёсць горад Кіеў — маці гарадоў рускіх? Прыгадайце, пад якімі лозунгамі штурмаваў Л. Кучма прэзідэнцкае крэсла, як шчодра паліваў аднаго з белавежскіх «зуброў» і параўнайце яго словы са справай. Здаецца, Данілыча пераплюнуў. Неўзабаве, трэба меркаваць, дабрадзеі Біл і Гельмут будуць ліць віскі на прэзентацыі ўкраінскага стэпавага падводнага флоту.

Ну і на здароўе. У сваёй беларускай «хаце» мы як-небудзь без памочнікаў прыбяром смецце.

Аляксандр Лукашэнка — чалавек іншага складу. Галоўны яго «мінус» — ніякімі пернікамі, ніякімі абяцанкамі яго не купіць. З'есць «пернік» не вагаючыся і не паглядзіць на каштоўныя забугорныя дырэктывы, «як праводзіць рэформы». Справай бярэ, розумам. А дзе вопыту не хапае — выручае інтуіцыя.

Калі так — іншым спосабам, непадкупных не бывае. Зазвінела ў некага ў кішэні, і пайшло-паехала: «Ату яго!» Быў бы заклік, а каму падхапіць яго заўсёды знойдзецца. Тут і пакрыўджаныя банкіры-«прафесіяналы» (ударыў «дылетант» ад эканомікі па брудных руках), і некаторыя з тых, хто прайграў прэзідэнцкі паядынак, і збанкрутаваныя палітыканы (ужо рыхтуюцца, відаць, да новага марафону), нарэшце, проста чорныя зайздроснікі. Дададзім сюды яшчэ частку дэпутатаў-лайдакоў, якіх жыццё сваіх выбаршчыкаў больш не цікавіць (толькі б Прэзідэнт не забраў машыну, не патрабаваў вынікаў заканатворчай работы і пускаў праветрыцца за мяжу) — і карціна поўная. Вось хто стварыў «крызіс». Вось хто, падобна да персанажаў байкі дзядулі Крылова, цягне наш дзяржаўны воз у розныя бакі і пагражае дыктатурай, фашызмам.

Спрытна ж ты, скажа мне чытач, пудрыш мазгі, можа і добры чалавек Аляксандр Лукашэнка, можа і жадае ўсім нам дабра, але ж жыццё цяжкае, есці ж хочацца. Звінець у кішэні ўсё ж павінна.

Павінна. Заўтра хочаце? Вось возьме ён усе 25 працэнтаў мізэрнага бюджэту, якія «з'ядае» чарнобыльская праграма, і раздзеліць усім пароўну. Хопіць?

Жадаючых звон пачуць шмат, ды мала разумных дарадцаў, якія ведаюць, як у кароткія тэрміны ўтаймаваць эканамічны крызіс. Сапраўдных і бескарыслівых памочнікаў малавата ў Прэзідэнта. Гэта адчуваецца. Пацвярджэннем таму — уражанні ад Усебеларускага народнага сходу, што нядаўна адбыўся. Глядзеў па тэлевізары. Слухаў. Лішні раз пераканаўся, што Аляксандр Рыгоравіч выдатны прамоўца, што душой усёй і сэрцам ён з народам, што Лукашэнку сапраўды няма альтэрнатывы. У той жа час упершыню міжволі варухнулася думка трывогі: «Не патапіць бы нам нашага Прэзідэнта ў моры ліслівасці, хітрасці і ўсеагульнага «одобрямса». Выразна раптам зразумеў, што галоўную небяспеку для Аляксандра Рыгоравіча ўяўляе не злосная апазіцыя (гэта якраз нармальна: на тое і шчупак у моры, каб карась не драмаў), не Вярхоўны Савет, а людзі з бліжэйшага акружэння. Хто яны, што стаяць за спінай Першага чалавека ў дзяржаве: саветнікі, памочнікі, кансультанты..? Што думаюць на самай справе? Хто падставіць Лукашэнку ў чарговы раз? Хто, прыкрываючыся клопатам аб сапраўднай справе, стварае вакол Прэзідэнта ілюзію і тармозіць патрэбную для Аляксандра Рыгоравіча як паветра зваротную сувязь звяна народ—Прэзідэнт?

«Мне сказаў Чарнамырдзін..., сказаў Ельцын...» Залішняя шчырасць (не тое месца і не тая аўдыторыя). А ндобразычліўцам козыр: «Мы гаварылі, што Лукашэнка лятаў у Маскву па параду».

Нармальнаму чалавеку і без ляманту апазіцыі ясна, што, вырашаючы ў Маскве цэлы блок важных пытанняў, не мог Прэзідэнт не абмеркаваць унутрыпалітычнае становішча ў Беларусі. Гэта натуральна. Як снег зімой. На тое ён і Прэзідэнт, каб лятаць і вырашаць дзяржаўныя праблемы. Але ж уладальнік сціплага інтэлекту прыме «доказы» за чыстую манету: «Нешта цямніць Лукашэнка». А за галасы трэба змагацца, ёсць, на шчасце, частка электарату, да якой вельмі туга даходзіць. Промах? Як ёсць. Зноў апраўдвацца? Давядзецца, хоць, здаецца, Аляксандр Рыгоравіч і без таго занадта сыпле бісер перад свіннямі.

Трэба было, думаецца, паслухаць на сходзе і прадстаўнікоў апазіцыі. І крытыкаў найбольш вострых знайсці. На тое і веча.

Заўчасная эйфарыя шкодная. Усе мы са сваім Прэзідэнтам толькі закасалі рукавы. Наперадзе вялікая і цяжкая работа. Ірваць на грудзях кашулі і прызнавацца ў каханні будзем пазней, калі адолеем беднасць, калі будуць усе сцягі ў нас у гасцях. Прыгадайце ГКЧП. «Свабода! — скандзіравала ўся Расія, — Дэмакратыя! Рынак!» Што атрымалася? Пшык. Выбарчыя ідэі апляваны і дыскрэдытаваны. Што, праўда, удалося «дэмакратам» у суседняй дзяржаве пабудаваць, дык гэта дзяржаву крыміналу і стопрацэнтнай сацыяльнай неабароненасці чалавека працы.

Ужо чуюцца заклікі патрыятычнага адцення. Успомнілі пра душу, пра мараль. І чые заклікі? Усё тых жа рэфарматараў, якія благаслаўлялі ачумелы ад свабоды натоўп на звяржэнне «жалезнага Фелікса». У нас, дарэчы, Ільіч стаіць. І гэта зусім не перашкаджае нашаму Прэзідэнту і яго народу праводзіць рэформы, але разумна і ўзважана.

Вяду да таго, што вучыцца трэба на чужых памылках. Сёння Аляксандру Рыгоравічу як ніколі патрэбна наша падтрымка. Але, ратуй Божа, без мядзведжых паслуг. Вось і давайце акажам яму дапамогу. Усёй грамадой. Пара скончыць бясплённыя палітычныя баталіі і насільна выбіраць-давыбіраць дэпутатаў у Вярхоўны Савет. Усіх дастойных, колькі было, ужо, здаецца, выбралі.

А праблемы з пенсіямі, зарплатамі. Ёсць, на жаль, усё гэта. Але ж не ад добрага жыцця. Балявання ў час чумы не бывае. Чуму прыдумаў не Аляксандр Лукашэнка, ён шчыра з ёй змагаецца. Захаваем дзяржаву, узнімем эканоміку — ніхто, упэўнены, не застанецца пакрыўджаным. Але для гэтага, паўтаруся, трэба дапамагчы нашаму Прэзідэнту, неабходна падтрымаць яго варыянт Канстытуцыі. Будзем адседжвацца дома, чакаць царскіх падарункаў — ведайце, нашым вечным набыткам стануць танныя мексіканскія тэлесерыялы, вельмі дарагая, але агідная каўбаса і продаж на развес заходніх ануч, былых ва ўжытку. Заклінаю! Не станавіцеся добраахвотна на калені! Абаронім і адродзім нашу Белую Русь!

Мікалай ХУДЗЕНКА.

г. Баранавічы.

ЁН БЫЎ СІМВАЛАМ ПОСПЕХУ

3 лістапада 1996 года спаўняецца 40 дзён, як не стала Міколы Селешчука. Не стала выдатнага мастака, надзейнага сябра, клапатлівага сына...

Ён ніколі не гаварыў ні з кім пра смерць. Нават калі заўчасна памёр яго бацька. Міколу тады было крыху больш за 30 гадоў. Ён быў сам не свой ад страты. Узяўся пісаць карціну «Пахаванне бацькі»: родны чалавек у труне. Гэта было страшэнная пакутай, і Мікола неаднойчы кідаў пэндзаль ад нясцерпнага душэўнага болю і ўласнай бездапаможнасці перад смерцю.

Настаўнік з вучаніцай.

... Калі з далёкай Італіі, дзе мастак сёлета восенню адпачываў з сябрамі, на яго радзіму прыйшла вестка аб трагедыі, Беларусь анямела. Непраўдападобным здавалася тое, што, стоячы па калена ў вадзе, чалавек можа захлынуцца марской хваляй. Несправядлівай здалася смерць у 49 гадоў, на вяршыні славы, прызнання і папулярнасці. Але па расказах сяброў, што знаходзіліся побач у момант трагедыі, менавіта так усё і здарылася: гарачае сонца, цёплы пясок, блакітнае неба і ласкавая цёплая хваля... Для Міколы яна аказалася смяротнай. Вада з пяском трапіла ў лёгкія.

Пахавалі М. Селешчука на Брэстчыне, на паўвясковых могілках, побач з бацькам. Там пясчаная зямля, дубы і сосны.

Ніяк не праходзіць адчуванне пустаты, што ўтварылася ў прасторы на тым месцы, у той геаграфічнай кропцы, дзе жыў і пісаў свае жыццярадасныя і трагічныя творы Мікола Селяшчук — адзін з найбольш адметных і вядомых мастакоў Беларусі.

Для многіх аматараў мастацтва Мікола Селяшчук з'яўляецца своеасаблівым сімвалам поспеху. Яго любілі як чалавека. Яго творы былі эфектнымі і ўражвалі публіку, іх куплялі для сваіх калекцый уладальнікі галерэй у замежжы.

Большасць лічыць, што яму лёгка ўсё давалася. Хаця гэта далёка не так.

У гэты сумны і ўрачысты дзень, калі на Беларусь прыйшлі Дзяды, і сярод Дзядоў ужо і наш Коля Селяшчук — пра яго ўспамінаюць блізкія сябры, з кім ён разам працаваў і вучыўся.

Уладзімір ТОЎСЦІК, *мастак.*

— У тыя часы, калі пачынаў свой творчы шлях Мікола, было нялёгка прабіцца да шырокай публікі. Селяшчук быў з простай сям'і, без якой-небудзь падтрымкі з боку тых, хто меў уладу... Але Мікола сваім уласным талентам, упартасцю, працаздольнасцю зламаў усе бар'еры — выйшаў і на ўсесаюзную арэну, і на міжнародную.

Мікола быў мяккі, кантактны чалавек, ён убіраў у сябе ўсё новае, у тым ліку і ідэі, што яшчэ толькі луналі ў паветры. Для мяне асабіста важным з'яўляецца не тое, які ён быў мілы чалавек, а тое, што ён значыў для свайго пакалення, як сваім прыкладам уплываў на іншых.

Мікола быў выдатным прафесіяналам. Ці ведаў ён формулу поспеху? Не магу сказаць. Але гэты самы поспех заваёўваўся цяжкай працай і самадысцыплінай.

Уладзімір САВІЧ, *мастак.*

— Роўна 26 гадоў мы ведалі адзін аднаго. А пазнаёміліся 26 верасня 1970 года... Разам вучыліся, працавалі ў адной майстэрні... Коля мне першым паказаў Вільню. Бывала, мы, студэнты, прапускалі заняткі, каб пабываць у Вільні. Маршрут наш быў просты: адразу з цягніка заходзілі ў магазін букіністычнай кнігі, куплялі там тое, што трэба, у 11.00 адчыняліся музеі — мы глядзелі выставы, пасля зноў кнігарня і ад'езд вечарам дамоў.

Разам мы пабывалі і ў Рызе, і ў Таліне, пазней — у Грэцыі, Фінляндыі, Італіі, Чарнагорыі — усю Еўропу аб'ехалі са сваімі выставамі.

Мы былі блізкія духоўна. Коля бываў часта ў мяне, у Койданаве, я — у ягоных сваякоў. Коля нарадзіўся на хутары, і ён паказваў мне гэтае месцы каля Вялікай Рыты. Цяпер там няма ўжо ніякіх пабудоў, засталіся толькі старыя ігрушы. Ён быў моцна звязаны з бацькоўскай зямлёй.

Скажу, што мой сябар Коля Селяшчук заўсёды жыў так, як ён хацеў жыць. Ён быў архітэктарам свайго жыцця. Таленавіта, прыгожа жыў.

Самае каштоўнае нашай 7-гадовай сумеснай працы ў адной майстэрні — гэта атмасфера творчасці, што заўсёды там панавала. Увесь час мы спрачаліся, што ёсць мастацтва, раіліся, пераконвалі адзін аднаго. Мяне цікавіла, у чым яго сакрэт, у чым ён адбыўся як мастак? Разумееце, для мяне Коля доўгі час быў загадкай. Гляджу на палатно: дэталі, кветкі, дрэвы, шыкоўныя строі... Гульня дэталяў. Мікола быў проста майстрам дэталі. І праз гэту дэталь ён адбыўся як мастак. А спачатку я ўспрымаў інакш: думалася, што за дэталлю хаваецца патаемны сэнс... Але гэта было не так. У Селешчука быў дзіўны Божы дар адчування плямы, колеру. Ён з лёгкасцю канструяваў кампазіцыю адразу на палатне, робячы гэта інтуітыўна геніяльна.

Кнігі, плакаты, паштоўкі — усё, за што браўся Мікола, было пазначана арыгінальнасцю, густам мастака.

Мікола КУПАВА, *мастак.*

— Мікола Селяшчук з той кагорты людзей, што пачынала новае беларускае мастацтва ў сярэдзіне 70-х гадоў. Ён — з пачынальнікаў, з тых, каму даводзілася перааадольваць процістаянне афіцыйнай ідэалогіі. Цяпер, з адлегласці часу, я прыгадваю гады нашай сумеснай вучобы ў Акадэміі мастацтваў. Мы ўсе, яго аднакурснікі, цяпер ужо вядомыя мастакі, у пэўным сэнсе абавязаны Міколе. Да ўсяго ён меў творчы падыход. І гэта ўплывала ў цэлым на групу.

Акрамя гэтага, Мікола Селяшчук быў сярод тых, хто пазней рэзка ўзняў планку беларускага мастацтва. Па ім, па яго творах можна акрэсліваць гэты сучасны ўзровень. І ў свеце праз творчасць Селешчука многія будуць меркаваць пра Беларусь. А яна ў яго — адухоўленая, загадкавая, з багатай гісторыяй і каларытнымі асобамі.

Ратамка. З сябрамі пасля гульні ў футбол.

... Перад ад'ездам у Італію Мікола Селяшчук пацвердзіў свой намер 4 лістапада зрабіць у маленькай зале Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі сваю выставу. «Трохі адпачну, а як прыеду, возьмемся за экспазіцыю», — паабяцаў ён супрацоўніку музея.

Як і планавалася, выстава адкрыецца 4 лістапада, але не ў маленькай зале, а на галерэі мастацкага музея. Творы для экспазіцыі падбіраў не аўтар, а яго сябры. Прыходзьце, прыязджайце на выставу, прысвечаную памяці Міколы Селешчука.

Таццяна АНТОНАВА.
Фота Я. КОКТЫША.

АНТАЛОГІЯ АДНАГО ВЕРША

Максім ЛУЖАНІН

ТРОХГАЛОССЕ

Тры нявольнікі ў родным слове...
Гнуў ланцуг іх і гнаў бізун.
Выйшлі поруч, напагатове,
Багдановіч, Гарэцкі, Гарун.

Рыхтаваўся нашчадак да стрэчы:
Кожны з іх [illegible] Эльбрус —
[illegible] на плечы
Багдановіч, Гарэцкі, Гарун.

І «таварыш», і «панове»,
Хто як мог нам глушыў струн.
Лёс паклікалі на адпаведзь
Багдановіч, Гарэцкі, Гарун.

Агалосіць, што нам не ўдалося,
Наскі покліч з курганоў і трун.
Мы адной з вамі нівы калоссе,
Багдановіч, Гарэцкі, Гарун.

Дай мне, Божа, дастойнае слова!
Слова гэткае мне даруй! —
Каб гарэлі, не гаснучы ў мове,
Багдановіч, Гарэцкі, Гарун.

З-ЗА НЕДАХВАТУ МАСЛА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паколькі Міхаіл Міхайлавіч нічога [illegible] не меў, мы разам з намеснікам начальніка ўпраўлення арганізацыі гандлю харчовых тавараў міністэрства Любоўю Язэпчык на службовай «Волзе» накіраваліся ў горад. [illegible] Прычым, журналісту было прапанавана выбраць любы мікрараён і любую гандлёвую кропку самастойна. Вызначыўшыся з накірункам, паехалі ў Заводскі раён.

АП гастраном «Аўтазаводскі», (Енісейская, 1) дырэктар Валянціна ПЕТРАШЭЎСКАЯ: — Праблем з маслам у нас няма, запасы ёсць на [illegible]. Гэтымі днямі таксама атрымалі айчынны маргарын «Сонечны» па 18.600 рублёў за кілаграм. [illegible] Ёсць у продажы і тры віды маянэзу.

АП «Заводскі» (вул. Нясцерава, 60А), дырэктар Уладзімір ІЛЬЯНОК: — Масла ёсць, [illegible] атрымалі 1,5 тоны айчыннага маргарыну. Ёсць у продажы і шэсць гатункаў замежнага, ёсць маянэз, які набываем у камерцыйных структур...

Ад далейшых паездак і наведванняў гандлёвых прадпрыемстваў журналіст адмовіўся. Усё гаварыла за тое, што масла, а таксама маргарын і маянэз павінны былі быць у продажы. Па словах Міхаіла Еўтухоўскага, такое ж становішча і ў рэгіёнах, дзе ёсць яго запасы на халадакамбінатах. Напрыклад, у Гомельскай вобласці на захоўванні — 97 тон масла, прычым гэта проста запас, паколькі ў гандаль прадукцыя ідзе непасрэдна з масласырзаводаў. Падобнае ж становішча і ў іншых абласцях краіны. Як бачна, чуткі аб картках не пацвердзіліся.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БЮЛЕТЭНІ НА РЭФЕРЭНДУМ БУДУЦЬ ПАДПІСАНЫ Ў ДРУК УВЕЧАРЫ 5 ЛІСТАПАДА

31 кастрычніка адбылося пасяджэнне Цэнтральнай камісіі па правядзенню выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Галоўныя пытанні былі прысвечаны маючаму адбыцца 24 лістапада ўсенароднаму рэферэндуму. Аднак у папярэдні праект парадку дня пасяджэння па прапанове Адміністрацыі Прэзідэнта быў уключаны пункт па змяненню і ўдакладненню формы бюлетэняў для галасавання. У прыватнасці, Прэзідэнт прапаноўвае друкаваць бюлетэні на рускай і беларускай мовах, а таксама змяніць графічны выгляд бюлетэняў, размяшчэнне пытанняў і г. д. Большасцю галасоў гэта пытанне было ўключана ў парадак дня нягледзячы на тое, што старшыня Цэнтрвыбаркома Віктар Ганчар прапанаваў яго адкласці на больш позні тэрмін.

Аргументацыя Віктара Іосіфавіча заключалася ў тым, што не трэба спяшацца падпісваць форму бюлетэня і аддаваць яе ў друк, паколькі, паводле яго інфармацыі, магчымы змяненні ў бліжэйшыя дні ў саставе пытанняў, вынесеных на рэферэндум. Папершае, Старшыня Вярхоўнага Савета давёў да ведама Цэнтрвыбаркома, што ў парламент ад Прэзідэнта паступіў праект пастановы Вярхоўнага Савета, у якой прапаноўваецца скасаваць тры альтэрнатыўныя прэзідэнцкія пытанні. Кіраўнік парламента паведаміў, што гэтая праблема будзе разгледжана 5 лістапада. Акрамя таго, лідэры фракцый аграрыяў і камуністаў зазначалі, што яны будуць выходзіць з ініцыятывай адклікання свайго альтэрнатыўнага праекта Канстытуцыі. Акрамя таго, у бліжэйшыя дні павінен даць заключэнне адносна праектаў Канстытуцыі і Канстытуцыйны суд, які можа выступіць за адкліканне праектаў, калі яны будуць прызнаны новымі варыянтамі Канстытуцыі. Таму Віктар Ганчар палічыў нэмэтазгодным спяшацца з друкаваннем бюлетэняў, каб не марнаваць дарма народныя грошы. Гэтая праблема ў канцы пасяджэння была абмеркавана з удзелам некалькіх юрыстаў з Адміністрацыі Прэзідэнта. І ў прыватнасці Аляксандр Абрамовіч, намеснік кіраўніка Адміністрацыі і папярэднік Ганчара на пасадзе старшыні Цэнтрвыбаркома, падтрымаў Віктара Іосіфавіча. Такім чынам, было прынята рашэнне аб тым, што Віктар Ганчар узгодніць з прэзідэнцкай юрыдычнай службай графічнае афармленне бюлетэняў на будучы рэферэндум, а пазней, 5 лістапада а 18 гадзіне, пасля заканчэння пасяджэння сесіі Вярхоўнага Савета Цэнтрвыбаркам канчаткова зацвердзіць форму бюлетэня, які будзе падпісаны і накіраваны ў друк.

Акрамя таго, Цэнтрвыбаркому было што абмеркаваць з прадстаўнікамі Адміністрацыі Прэзідэнта. У прыватнасці, праблемы фінансавання давыбараў і рэферэндуму. Паводле слоў Віктара Ганчара, на гэтыя мерапрыемствы патрабуецца 12 мільярдаў бюджэтных сродкаў, без уліку добраахвотных ахвяраванняў, якія ўжо паступілі на правядзенне рэферэндуму. Як вядома, часткова сродкі на правядзенне рэферэндуму былі накіраваны напрамую абласным фінупраўленням, мінуючы Цэнтрвыбарком. Але Віктар Ганчар і іншыя ўдзельнікі пасяджэння даволі жорстка паставілі пытанне аб тым, каб быў сфарміраваны каштарыс расходаў камісій па рэферэндуму, строгі разлік сродкаў, які паслужыў бы юрыдычнай асновай для іх расходавання і справаздачнасці. Аляксандр Абрамовіч таксама падтрымаў у гэтым Віктара Ганчара і зазначыў, што на нарадзе ў кіраўніка Адміністрацыі гэта пытанне абмяркоўвалася і прынята станоўчае рашэнне. У цэлым з фінансаваннем давыбараў і рэферэндуму сітуацыя настолькі ўскладнілася і заблыталася, што ўсё гэта ставіць пад пагрозу правядзенне давыбараў і рэферэндуму ў нашай краіне, — зазначаў падчас пасяджэння Віктар Ганчар. І хаця некаторыя кіраўнікі абласных камісій па рэферэндуму выказваліся, што яны гатовы пакуль што праводзіць гэтую кампанію на добраахвотных пачатках і бясплатна, большасць усё ж вырашыла патрабаваць тэрміновага вырашэння фінансавых пытанняў. Цэнтрвыбарком прыняў пастанову, згодна з якой Міністэрства фінансаў абавязваецца да 5 лістапада забяспечыць давыбары і правядзенне рэферэндуму неабходнымі для гэтага сродкамі.

Акрамя таго, Цэнтрвыбарком разгледзеў заяву ініцыятыўнай групы грамадзян пад кіраўніцтвам Генадзя Шчарбініна, якія збіраюць подпісы для правядзення свайго рэферэндуму. Апошняму было рэкамендавана выправіць недахопы ў прадстаўленых матэрыялах.

Валер КАЛІНОЎСКІ.

РОЗГАЛАС

«ПРОСТЫЯ ЛЮДЗІ ХОЧУЦЬ СПАКОЙНА ЖЫЦЬ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вядома, не трэба думаць, што мы ўсіх завалім гэтымі крэдытамі, трэба паступова разгортваць будаўніцтва жылля ў рэспубліцы і думаць, як забяспечыць ім людзей».

Асноўную ролю ў выбары падыходзячага варыянта для вырашэння жыллёвай праблемы адыгрывае, вядома, кошт жылля. Цікава, што будаўніцтва дамоў у Ракуцёўшчыне абышлося ў два разы танней, чым прывычныя мінскія кватэры ў шматпавярховых дамах. Хоць, у прынцыпе, павінна быць наадварот: у гарадах больш развітая сетка камунікацый. Таму маладзечанскі эксперымент будзе прадоўжаны ўжо ў сталіцы. Як паведаміў Аляксандр Лукашэнка, у бліжэйшы час такімі дамамі будзе забудавана некалькі ўчасткаў у Мінску. Не застанецца без увагі і нарвежскі праект, з якім кіраўнік дзяржавы азнаёміўся ў час наведвання сталічнага мікрараёна Малінаўка. На думку Прэзідэнта, выкарыстоўваючы «ноу-хау» і айчынныя будматэрыялы, мы зможам у 3-4 разы знізіць кошт квадратнага метра жылля.

Такім чынам, стратэгія развіцця жыллёвага будаўніцтва ў рэспубліцы паступова пачынае рэалізоўвацца на практыцы. «Мы хочам навучыць людзей будаваць, даць ім узоры, каб, атрымаўшы крэдыт, чалавек мог выбраць па свайму густу і зыходзячы са сваіх фінансавых магчымасцей, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Цэны на дамы будуць знаходзіцца пад маім непасрэдным кантролем. А паколькі сёння будаўнікі не занятыя, ідзе пэўная канкурэнцыя, то чалавек зможа сам выбраць будаўніка, можа дзесьці і збіць цану. Вось на што я арыентую людзей і дзяржаву ў будаўніцтве жылля. Усё гэта многімі ўспрымалася негатыўна, нават ва ўрадзе. Але сёння ўжо ўсе прызналі — так, сапраўды, трэба паказаць людзям, як яны могуць вырашыць праблему з жыллём».

Другая частка рабочай паездкі кіраўніка дзяржавы пачалася з наведвання навукова-вытворчага прадпрыемства «Струм», якое выпускае медыцынскія інструменты для стаматалогіі і хірургіі. Гэты аб'ект быў выбраны не выпадкова. Як сказаў Аляксандр Лукашэнка ў адным са сваіх нядаўніх выступленняў, наступны год стане годам карэннага рэфарміравання айчыннай сістэмы аховы здароўя. Таму ён асабіста хацеў азнаёміцца з прадпрыемствам, якое, займаючыся выключна выпускам прадукцыі медыцынскага прызначэння, працуе прыбыткова і спрабуе канкурыраваць на сусветным рынку.

Народнае аб'яднанне «Маладзечнамэбля» працуе стабільна. Яно стала апошнім пунктам знаходжання Прэзідэнта на маладзечанскай зямлі. За апошнія 9 месяцаў работы аб'ём выпускаемай на прадпрыемстве прадукцыі ўзрос на 27 працэнтаў. На працягу апошніх двух гадоў на аб'яднанні дадаткова створана 400 рабочых месцаў. Дарэчы, гэту акалічнасць Аляксандр Лукашэнка адзначыў асабліва і падкрэсліў, што дзяржаўная дапамога будзе аказвацца ў першую чаргу тым прадпрыемствам, на якіх вырашаюцца праблемы занятасці насельніцтва шляхам стварэння новых рабочых месцаў.

У час наведвання аб'яднання «Маладзечнамэбля» Прэзідэнта неаднаразова спынялі рабочыя гэтага прадпрыемства і задавалі яму пытанні на самыя розныя тэмы, у тым ліку і наконт унутрыпалітычнай сітуацыі ў рэспубліцы. Аляксандр Лукашэнка растлумачыў сваё выступленне на нядаўняй сустрэчы з ветэранамі. «Я сказаў, што ў мяне ёсць права роспуску Вярхоўнага Савета, — адзначыў Прэзідэнт. — Але я потым удакладніў: хоць поле для кампрамісу і вузкае, але яно засталося. І мы павінны ісці шляхам кампрамісу. Таму што мне не трэба нагнятанне абстаноўкі ў краіне. Людзі хочуць жыць спакойна і працаваць. Але калі хтосьці гэтага не разумее, хоча дэстабілізаваць абстаноўку і ўзарваць яе, то я павінен калі-небудзь і ўладу прымяніць. Я не думаю, што суддзі Канстытуцыйнага суда абсалютна страцяць галаву, я ў гэта не веру. Таму нават не хочацца сёння гаварыць аб тым, што я буду прымаць нейкія меры, я проста не веру, што Канстытуцыйны суд можа вось так яўна растаптаць не толькі думку і волю Прэзідэнта, але і волю народа».

Эдуард ПІВАВАР, БЕЛТА.

АДНЫМ СКАЗАМ

- Па прагнозах спецыялістаў ААН, да 2000 года практычна **кожная другая сям'я** ў Беларусі будзе мець уласны легкавы аўтамабіль.
- Смяротнасць у Расіі ў 1,6 раза **перавышае** нараджальнасць.
- Кошт «спажывецкай карзінкі» з **19 асноўных прадуктаў** харчавання складае цяпер каля 500 тысяч рублёў.
- **Самай моцнай жанчынай** на планеце спецыялісты лічаць 28-гадовую Кэры Будро, рост якой 1,48 м, а вага — 54 кг: гэта мініяцюрная маладая жанчына выжымае штангу вагой у 225 кг, што больш чым у чатыры разы перавышае яе ўласную вагу.
- За апошнія 5 гадоў у рэспубліцы **ўзрасла колькасць** прыватных легкавых аўтамабіляў у 1,5 раза.
- У чарговы раз мытнікі «Заходняга Буга» **затрымалі** ў Кобрынскім раёне **грузавік**, у якім знайшлі спірту і гарэлкі на суму больш чым 216 мільёнаў рублёў.
- **У БДУ** сёння вучыцца каля 15 тысяч студэнтаў.

ВЯДУЧЫЯ ЮРЫСТЫ КРАІНЫ ПЕРАСЦЕРАГАЮЦЬ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Зыходзячы з вышэйсказанага, Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь лічыць, што Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму ў Рэспубліцы Беларусь і мерах па яго забеспячэнню» з'яўляецца не нарматыўна-прававым актам, а актам правапрымянення. Акты правапрымянення, зыходзячы з сэнсу артыкула 127 Канстытуцыі і часткі другой артыкула 5 Закона «Аб Канстытуцыйным судзе Рэспублікі Беларусь», не могуць з'яўляцца прадметам разгляду ў Канстытуцыйным судзе Рэспублікі Беларусь», — лічыць міністр.

Ён адзначае, што пункты 2.2 і 2.5 гэтай пастановы не павінны разглядацца па сутнасці фармулёвак, паколькі самі тэксты праектаў у выніку таго, што Канстытуцыйны суд не валодае правам папярэдняга кантролю, не могуць з'яўляцца прадметам разгляду Канстытуцыйнага суда.

«Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь не змяшчае абмежаванняў або забарон змянення тых ці іншых раздзелаў, глаў і артыкулаў, а таксама не агаворвае, што ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у пэўныя раздзелы, главы або артыкулы прыводзіць да прыняцця новай Канстытуцыі», — адзначае Валянцін Сукала. Ён канстатуе, што дзеючы Асноўны закон не дае адназначнага адказу на пытанне аб магчымасці прыняцця новай Канстытуцыі шляхам рэферэндуму. Так, артыкул 149 Канстытуцыі агаворвае, што законы аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, акты аб яе тлумачэнні лічацца прынятымі, калі за іх прагаласавала не менш чым дзве трэці ад выбраных дэпутатаў або большасць грамадзян, унесеных у спісы для галасавання на рэферэндуме. Разам з тым артыкул 73 Асноўнага закона прадугледжвае магчымасць вырашэння важнейшых пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця шляхам рэферэндуму, падкрэслівае міністр.

УЛАДЗІМІР КАРАВАЙ, СТАРШЫНЯ ВЯРХОЎНАГА СУДА

Як адзначыў у пісьме кіраўнік Вярхоўнага суда, згодна з артыкулам 15 Закона «Аб народным галасаванні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь», Вярхоўны Савет назначае рэферэндум шляхам прыняцця пастановы. Яго кампетэнцыя пры гэтым абмяжоўваецца назначэннем даты плебісцыту, фармулёўкай пастаўленых на рэферэндум пытанняў для далейшага ўключэння ў бюлетэнь, вызначэннем парадку фінансавання і іншых арганізацыйных мерапрыемстваў, звязаных з правядзеннем народнага галасавання.

Што ж датычыць сутнасці заведзенай Канстытуцыйным судом справы, то, згодна з законам, ён павінен разглядаць пытанні аб адпаведнасці нарматыўных актаў, а не іх праектаў, адзначае кіраўнік Вярхоўнага суда. Разам з тым ён звяртае ўвагу Канстытуцыйнага суда на той факт, што пытанні, сфармуляваныя ў трох пунктах гэтай пастановы, датычаць не дзеючага заканадаўства, а яго праектаў.

«Канстытуцыйны суд не можа абмяркоўваць, ці з'яўляюцца пастаўленыя на рэферэндум у праектах пытанні прыняццем новай Канстытуцыі або дапаўненнямі і змяненнямі ў дзеючую, ацэньваць фармулёўкі пытанняў рэферэндуму, паколькі гэта з'яўляецца выключнай кампетэнцыяй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь», — робіць высновы Уладзімір Каравай.

Уладзімір Каравай выказаў сваю думку і наконт пытання, якое цяпер шырока абмяркоўваецца ў грамадстве: ці можа прымацца новая Канстытуцыя шляхам рэферэндуму? У сувязі з гэтым ён адзначыў, што ў дзеючай Канстытуцыі замацавана, што адзінай крыніцай дзяржаўнай улады з'яўляецца народ, а ў законе аб рэферэндуме і Канстытуцыі прама сказана: «змяненні і дапаўненні Канстытуцыі могуць быць праведзены праз рэферэндум». Згодна са Слоўнікам рускай мовы С. І. Ожагава, Рускім тлумачальным слоўнікам пад рэдакцыяй Лапаціных, Руска-беларускім слоўнікам пад рэдакцыяй К. Крапівы, слова «изменения» трактуецца як «перамены, што змяняюць што-небудзь ранейшае». Супастаўляючы першую і другую часткі артыкула 149 Канстытуцыі, можна гаварыць аб тым, што калі першая рэгулюе пытанні ўнясення змяненняў у Канстытуцыю, то другая — змяненні самой Канстытуцыі. Тым больш, што дзеючы Асноўны закон не забараняе прымаць новую Канстытуцыю шляхам народнага галасавання, падкрэслівае Уладзімір Каравай.

УЛАДЗІМІР БОЙКА, СТАРШЫНЯ ВЫШЭЙШАГА ГАСПАДАРЧАГА СУДА

У пісьме на імя старшыні Канстытуцыйнага суда Уладзімір Бойка прыводзіць шэраг высноў, зробленых на аснове аналізу гэтай пастановы парламента і звязаных з ёю актаў заканадаўства, у прыватнасці, адзначаецца, што, згодна з заканадаўствам, да прыняцця рашэння па пытаннях, якія вывучаюцца або разглядаюцца Канстытуцыйным судом, ні адзін з яго членаў не мае права публічна выказваць свае думкі, калі гэта не вынікае з неабходнасці падрыхтоўкі пытання да абмеркавання ў Канстытуцыйным судзе. Тым больш, што рэгламентам Канстытуцыйнага суда гарантуецца аб'ектыўнасць гэтага органа і кожнага з яго суддзяў пры разглядзе спраў. У выпадку, калі можа быць пастаўлена пад сумненне аб'ектыўнасць суддзі ў выніку прамой або ўскоснай зацікаўленасці ў зыходзе вырашэння канкрэтнай справы, ён павінен заявіць аб самаадводзе, гаворыцца ў рэгламенце.

Разам з тым, на думку Уладзіміра Бойкі, у выступленнях на сесіі Вярхоўнага Савета і ў сродках масавай інфармацыі старшыня Канстытуцыйнага суда і практычна ўсе суддзі выказаліся аб тым, што ўносіць на разгляд рэспубліканскага рэферэндуму праект Канстытуцыі, ініцыіраваны Прэзідэнтам, нельга, паколькі гэта цэласны дакумент, а не змяненні і дапаўненні.

«У гэтай сувязі Канстытуцыйнаму суду, на наш погляд, неабходна прааналізаваць усе публічныя выступленні суддзяў Канстытуцыйнага суда па гэтаму пытанню і вырашыць, ці не заяўляюць яны аб самаадводзе», — лічыць кіраўнік Вышэйшага гаспадарчага суда.

Пачаўшы падрыхтоўку і разгляд гэтай справы, Канстытуцыйны суд па сутнасці дае ацэнкі не толькі пастанове Вярхоўнага Савета, але і праекту Канстытуцыі. Аб чым сведчыць заява Канстытуцыйнага суда, адрасаваная Прэзідэнту краіны і групе дэпутатаў Вярхоўнага Савета. У ёй, у прыватнасці, гаворыцца: «На думку суда, паспешныя і непрадуманыя ініцыятывы па канстытуцыйнаму рэфарміраванню абвастрылі і без таго складанае становішча ў рэспубліцы, узмацнілі палярызацыю грамадскіх думак, што тоіць у сабе непрадказальныя вынікі для маладой беларускай дзяржавы». Гэта супярэчыць артыкулу 5 Закона «Аб Канстытуцыйным судзе Рэспублікі Беларусь» і артыкулу 125 Асноўнага закона, якія замацоўваюць за Вярхоўным Саветам, але не за Канстытуцыйным судом, права на абмеркаванне праектаў нарматыўных актаў, падкрэсліў Уладзімір Бойка.

Завяршаючы сваё пісьмо, старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда адзначыў, што «дзеючая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь не змяшчае забароны на прыняцце новай Канстытуцыі шляхам рэферэндуму. Адказы многіх экспертаў, якія ўдзельнічалі ў разглядзе гэтай справы, нельга браць пад увагу, паколькі тлумачэнне артыкула 149 Канстытуцыі таксама належыць органу, які прыняў яе, гэта значыць Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь».

БЕЛТА.

Думы мае да Дзядоў даплываюць аблочна

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

[illegible]

Я нахіляюся ніц — да Дзядоў, прарастаю да Бога — Дзядам насустрэчу. Я прырастаю да Краю, над Краем згараю, каб вечна гэтай зямельцы збалелай і чыстай-святочнай стуль, з недасяжнай таемнасці, быць паратункам, апірышчам і спадзяваннем.

... Думаў маіх пералётныя птахі да выраю мкнуцца, да вечнасці Божай. Божа, не дай мне забыцца дадому дарогу. Думы Купалавы з выраю веру праменяць. Гэтаю верай нягаснай жывая Айчына. Гэтая вера Купалу ў бядзе сілкавала, і продкаў да нас — да цяпла — павяртае. З далечыні непрагляднай гаворыць яснотна Купала: «Знойдзеш Бацькаўшчыну блізка». Блізка да сэрца, да памяці родавай блізка я пралятаю адчайнаю, слёзнаю знічкай — з Дзядамі спаткацца... Вярнуцца ў радзіну.

А нада мной зараніцай світальнаю ўсходзяць Купалавы словы да продкаў — шукальнікаў волі: «Спеце: мы вашых навек не забудзем магілаў». Збуджаны вамі, мы ўскрэслі, мы больш не заснём!

II.

... Дзень узышоў над зямлёю — збылося святое ўзнясенне. Сонца мне зноў дасылае сваё дараванне, лагоду — не дакарае маім беспрытульствам загубным, гаротай маёю. Восень лістоту ссыпае, ссыпае да долу, распальвае тонкія свечкі ў прасторы, каб на дарозе маёй ад учора да заўтра надзея святлела. Восень мяне закалыхвае ў зыбцы сусветнай — выпешчвае парастак-памяць. І над Краінай маёю пакутнай агні ўваскрасаюць знічовы, агні павяртання. Я павяртаюся дзедавай сцежкай дадому, да роду-радзіны. І да мяне павяртаюцца з прыцемкаў продкі. Яскру, што я распаліла ўспамінам у сэрцы, ні [illegible]

[illegible] ручнік на акне — пуцявіна яднання. Белы набожнік на покуці — знак абуджэння нашых зямных бальшакоў пад аховаю Божай.

Роду мой, родзе! Няўмерлы, цярплівы народзе. Буду маліцца, укленчваць, прасветлена плакаць, буду наросхрыст раскрыльваць гарачыя рукі — толькі пачуйце, пачуйце мой голас, шаптанне-варожбу. Толькі ўздымеце галовы, на дыбачкі станьце і зазірнеце за плот, што ашчэрыўся люта паміж сапраўднымі, існымі намі і ценем народа-няўклюды, нядбайцы. Толькі знайдзеце ў бяздоннях бяспамяцтва-згубы дзедавай памяці яскарку-кроплю і наталеце сасмяглыя вусны нямыя матчынай мовы жывою вадою, святою. І прамаўляйце, спявайце, крычэце балесна — хай нас пачуюць Дзяды ў паднябессі нягасным. Хай нашы сэрцы пульсуюць, шчымліва трапечуць памкненнем зведаць суладнасць, супольнасць у Космасе жыццяў. Хай нас пачуюць Скарына, Гусоўскі, Купала... Пабагацеем святлом неадольнай любові і павышэем душою да самых вяршыняў, скуль нашы продкі гавораць, лякуюць, гартуюць, каб не згубіўся ў бясвеццы народ беларускі — гордых і мужных, князёў, мысляроў, хлебадараў...

Ноча Дзядовая... Роздум, развага, спатканне. Ночы Дзядовай гаркота і сум абуджальны. Свечкі на вокнах радзімных — пасланцы да Бога. Ціша. Прачуласць. Дзядоў асцярожныя крокі. Уваскрасае Радзіма — Дзядоў сустракае. Вяртаецца ў памяць.

Толькі радкоў маіх боль працінае бяздомнасць. А, можа... словы мае хоць адненькае сэрца параняць — і да Дзядоў тое сэрцайка знойдзе дарогу...

Антаніна ХАТЭНКА.

У МЕДЫЦЫНСКАГА — ЮБІЛЕЙ

У гісторыі Мінскага медыцынскага інстытута перагорнута чарговая старонка: споўнілася семдзесят пяць гадоў з таго часу, калі ён быў заснаваны як адзін з факультэтаў Белдзяржуніверсітэта. Праз дзесяць гадоў гэты факультэт стаў ужо невялікай самастойнай вышэйшай навучальнай установай.

Сёння медінстытут з'яўляецца адной з буйнейшых ВНУ Беларусі. Сорак тысяч спецыялістаў падрыхтавана тут за мінулы час. У яго сценах пачыналі свой шлях многія зоркі айчыннай навукі, зараджаліся новыя накірункі тэорыі і практыкі.

НА ЗДЫМКАХ: лекцыю чытае прафесар Аляксандр Аляксандравіч АРЦІШЭЎСКІ; у гэтай аўдыторыі навучанне праводзіцца з дапамогай камп'ютэрнай тэхнікі.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аб узнагароджанні групы супрацоўнікаў Мінскага медыцынскага інстытута Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе**:

За шматгадовую плённую навукова-даследчую дзейнасць, значны ўклад у справу падрыхтоўкі высокакваліфікаваных урачэбных кадраў узнагародзіць Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь:

Астапава Анатолія Архіпавіча — дацэнта, загадчыка кафедры дзіцячых інфекцыйных хвароб.

Баркоўскага Яўгенія Віктаравіча — прафесара, загадчыка кафедры агульнай хіміі.

Герасімовіча Георгія Ігнацьевіча — прафесара, загадчыка кафедры акушэрства і гінекалогіі.

Дзечку Валерыя Міхайлавіча — дацэнта кафедры аператыўнай хірургіі і тапаграфічнай анатоміі.

Зайца Рамана Георгіевіча — дацэнта, загадчыка кафедры біялогіі.

Ільіча Генрыха Казіміравіча — загадчыка кафедры медыцынскай і біялагічнай фізікі.

Каскевіча Леаніда Іванавіча — дацэнта, дэкана лячэбна-прафілактычнага факультэта.

Лаўрыненку Георгія Васільевіча — дацэнта, загадчыка кафедры гігіены дзяцей і падлеткаў.

Мануліка Уладзіміра Аляксандравіча — дацэнта кафедры нармальнай анатоміі.

Марквардзэ Мечыслава Мар'янавіча — прафесара, загадчыка кафедры прамянёвай дыягностыкі.

Чысценку Рыгора Мікалаевіча — дацэнта, загадчыка кафедры эпідэміялогіі.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШАРЭЦКІ

30 кастрычніка 1996 г.,
г. Мінск
№ 731-XIII

БАСКЕТБОЛ

БАСНІЙСКАЕ НАСТУПЛЕННЕ НА БЕЛАРУСЬ ЗАКОНЧЫЛАСЯ ЎДАЛА

Чарговы адборачны матч чэмпіянату Еўропы па баскетболу, які пазаўчора зборная Беларусі правяла дома з камандай Босніі і Герцагавіны, быў, як кажуць, на радасць гасцям, гаспадарам жа прынёс засмучэнне.

Поўны зал балельшчыкаў, якія запоўнілі мінскі Палац спорту (уваход быў свабодны), не шкадуючы сваіх далоняў, скандзіравалі: «Бе-ла-русь! Бела-русь!» Шчыра скажам, нашы аматары баскетбола ўжо засумавалі па добрай гульні, таму патрабавалі ад сваіх куміраў толькі перамогі. Зрэшты, у першым тайме ўсё да таго і ішло: «легіянеры» Грышчук, Байдакоў, Жаладук памалу-паціху «нарошчвалі абароты» ачковай перавагі беларусаў: 10:2.., 21:7.., 24:9... Ці варта было хвалявацца, маючы такую розніцу? Аднак здарылася тое, што здарылася. Адчуўшы нейкае лёгкае расслабленне, беларускія баскетбалісты пачалі элементарна памыляцца, і ўжо пасля першай паловы выйгравалі ўсяго 4 ачкі — 35:31.

Другі ж тайм можна смела заносіць у гісторыю зборнай Беларусі як адзін з найбольш драматычных. Асноўны час, які закончыўся ўнічыю — 58:58, дадатковыя пяціхвілінкі і агульная перамога баснійцаў — 61:73 паказыталі нервы і спартсменаў, і настаўнікаў і, вядома ж, пакрыўджаных балельшчыкаў. Як кінуў са злосці пасля гульні адзін з іх: «Добра што грошы за білеты не бралі. Відаць, ведалі, што рабілі».

Алесь СІВЫ.

У СВЕЦЕ

ПЕЛЕНГ-НАВІНЫ

КАНФЛІКТ ПАМІЖ ІЗРАІЛЕМ І ПАЛЕСЦІНАЙ ВЫРАШАЕЦЦА

Прадстаўнік ЗША на Блізкім Усходзе Дэніс Рос заявіў, што Ізраіль і палесцінцы наблізіліся да дасягнення пагаднення аб будучыні горада Хеўрон. Рос сказаў у Вашынгтоне, што рознагалоссі бакоў неістотныя і таму няма неабходнасці яму вяртацца на Блізкі Усход для далейшых перамоў з лідэрам Палесцінскай аўтаноміі Арафатам. У адпаведнасці з пагадненнем ізраільскія войскі застануцца толькі ў той частцы Хеўрона, дзе пражываюць 450 яўрэйскіх пасяленцаў.

АЗЕРБАЙДЖАН НЕ МАЕ НАМЕРУ ДАВАЦЬ КАРАБАХУ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

Удзельнікамі чарговага раунда перамоў па праблеме Нагорнага Карабаха, які праходзіў у Маскве пры пасрэдніцтве АБСЕ, не ўдалося дасягнуць якіх бы там ні было станоўчых вынікаў. Азербайджан, які прапаноўвае Карабаху самую шырокую аўтаномію, працягвае настойваць на тым, што гэта тэрыторыя — неад'емная частка Азербайджана.

ІРА ПАГРАЖАЕ ЎЗАРВАЦЬ САМУЮ БУЙНУЮ ВАЕННА-ПАВЕТРАНУЮ БАЗУ ВЯЛІКАБРЫТАНІІ Ў ІРЛАНДЫІ

Ваенна-паветраная база ў Вялікабрытаніі ў паўночна-ірландскім графстве Арма пераведзена на надзвычайны рэжым у сувязі з пагрозамі Ірландскай рэспубліканскай арміі (ІРА). Паводле даных ваенных крыніц, ІРА закупіла ў Лівіі і даставіла ў Ольстэр як мінімум 10 партатыўных пускавых ракетных установак і мае намер ажыццявіць напад на базу ВПС. Гэта база — самы буйны фарпост Вялікабрытаніі ў Паўночнай Ірландыі. Праз яе ажыццяўляюцца ўсе армейскія перавозкі ў Ольстэр.

Паводле паведамленняў радыё «Свабода», «Голас Амерыкі», Радыё Расіі» і «Радыё-РОКС».

ІНФАРМ-КАКТЭЙЛЬ

Румынскі мільянер Аляксандру Іліе вядомы ў сябе на радзіме, а цяпер і за мяжой экстравагантнымі праектамі. Пасля дэманстрацыі ў Румыніі амерыканскага тэлесерыяла «Далас», які карыстаўся незвычайнай папулярнасцю, ён пабудаваў на зямельным участку, што належыць яму, копію ранча — месца дзеяння серыяла. Цяпер Іліе будуе побач 40-метровую копію Эйфелевай вежы. Абодва аб'екты — прынада для турыстаў, якія ўсё часцей наведваюць курортную мясцовасць, дзе знаходзіцца яго маёнтак.

Асашыэйтэд Прэс

З дапамогай міні-перадатчыкаў, якія былі прымацаваны да дзіцянят пінгвінаў, амерыканскі вучоны Джэральд Куймэн вырашыў устанавіць, дзе праводзяць першыя гады свайго жыцця гэтыя птушкі. Да гэтага часу было вядома, што прыкладна праз шэсць месяцаў пінгвіняты пакідаюць сваіх бацькоў і толькі праз пяць гадоў вяртаюцца на скаваны лёдам кантынент. Лічылася, што яны праводзяць гэтыя гады ў прыбярэжным моры Рос. Вынікі радыёпеленгу пяці пінгвінят сталі навуковай сенсацыяй. Праз тры месяцы з пачатку эксперыменту іх знайшлі за 2845 кіламетраў ад бацькоўскіх месцаў у больш цёплых водах на 57-м градусе паўднёвай шырыні.

«Шпігель»

НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

ЛІСТАПАД

У старажытнасці гэты месяц меў назву грудзень (ад слова груды — замёрзлая зямля). Сучаснае найменне тлумачыцца проста: канец ападання лісцяў з дрэў. Падобныя назвы ў польскай, чэшскай і ўкраінскай мовах. Астатнія еўрапейскія назвы ўтрымліваюць агульную лацінскую аснову novem—дзевяць (у Старажытным Рыме гэты месяц быў дзевятым).

1. Памінальны дзень у католікаў — Усе Святыя. Варылі кашу, ставілі на стол шклянку вады, клалі хлеб і столькі лыжак, колькі ў хаце «дзядоў» (памерлых продкаў).

4. Казанская. Свята абраза Казанскай Божай Маці. Угадвалі надвор'е на зіму: «Што Казанская пакажа, тое зіма скажа». Спрыяльным гэты дзень лічыўся для тых, хто браў шлюб: «Хто на Казанскую жаніхаецца, той не пакаецца».

8. Зміцер (Змітрок, Дзмітры) — «хітры» дзень, своеасаблівы апагей вясельнай пары. «Святы Змітры — людзі хітры, чаны параць, піва вараць, сыноў жэняць, дачок даюць». Да гэтага часу дзяўчаты яшчэ маглі перабіраць жаніхоў, але пасля, з-за набліжэння посту, спяшаліся з вяселлем. «Да Дзмітра баба хітра, а па Дзмітры — мужчына хітры».

10. Параскева Пятніца (Параскі). У гэты дзень забаранялася прасці і ткаць, выносіць попел, рабіць луг для мыцця бялізны, а мужчынам — араць. Існавала павер'е: калі хто будзе прасці, то з-пад печкі вылезе Пятніца і пакарае. Многія жанчыны не пралі па пятніцах цэлы год.

11. Мартын па каталіцкім календары. Лічылася, што ў гэты дзень мядзведзь кладзецца ў бярлог і пачынае смактаць лапу. Варажылі на надвор'е: калі на Мартына дождж ці разводдзе — на Каляды лёд, а лета будзе мокрае. У гэты дзень таксама стрыглі і даглядалі авечак.

14. Кузьма-Дзям'ян — апякун земляробства і вяселля, свята шаўцоў, кавалёў.

21. Міхайла (Міхайлаў дзень) — абаронца ад грому, апошняе свята года. У гэты дзень унукі наведвалі сваіх бабуль. Лічылася, што да Міхайлы ўжо трэба выткаць адны кросны. «На Міхайлу раздарожжа — да зімовага Міколы шляху не будзе», «Міхайла ў інеі прыйдзе — снежная зіма наступае, а калі туманам Міхайла спавіты — быць адлізе».

25. Іван Міласцівы. На Палессі ў гэты дзень стараліся хоць чым-небудзь з кім-небудзь падзяліцца. Калі ў гэты дзень ішоў дождж або снег, то меркавалі, што аж да Грамніц будуць адлігі.

27. Юстыніян. Гэтага святога лічылі збавіцелем ад бясплоднасці. Яго абраз абавязкова мелі бяздзетныя сем'і ці тыя, у каго паміралі дзеці.

28. Піліпаўка (Калядны, Піліпаўскі пост). Пачынаўся шасцітыднёвы перадкалядны пост. Лічылася, што ў Піліпаўку збіралася «воўчае вяселле», ваўкі хадзілі зграямі.

КУРЫНЫЯ ЯЙКІ КАРЫСТАЮЦЦА ПОПЫТАМ ЯК НІКОЛІ

Не інакш як нейкая навала праследуе апошнім часам мінчан: услед за дэфіцытам мясных паўфабрыкатаў, чутках аб адсутнасці масла, з продажу зніклі... курыныя яйкі. Нават на Камароўскім рынку, дзе заўсёды можна знайсці тое, чаго не хапае ў дзяржгандлі, гэты прадукт разыходзіцца апошнім часам штодзень да 11 гадзін.

Ну, калі галоўная «харчовая крама» не вытрымала такога выпрабавання, праблема, трэба меркаваць, сапраўды сур'ёзная.

Гэта, дарэчы, пацвердзілі і ў вытворча-гандлёвым упраўленні грамадскага харчавання Мінгарвыканкома, адзначыўшы, праўда, што, нягледзячы на складанасці ў забеспячэнні горада курынымі яйкамі, усе заяўкі (зразумела, найперш школ, бальніц і г. д.) выконваюцца заўсёды. Значна горшае становішча ў гандлі. Прынамсі, ад тых 700 тысяч яек у дзень, што пастаўляюць гораду птушкафабрыкі, нічога не застаецца, хаця тэарэтычна гэта павінна задаволіць патрэбу насельніцтва. Спецыялісты ўпраўлення гандлю Мінгарвыканкома тлумачаць такі попыт насельніцтва, у прыватнасці, тым, што курыныя яйкі — пакуль самы танны прадукт харчавання і людзі, напалоханыя магчымым павелічэннем яго кошту, бяруць іх у запас. Інакш як яшчэ растлумачыць, што 28 фірменных магазінаў «Белптушкапрома» разам са шматлікімі іншагароднімі пастаўшчыкамі ледзь паспяваюць забяспечваць сталіцу яйкамі?

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗДАРЭННІ

ПАЖАР У ГАСЦІНІЦЫ: АБЫШЛОСЯ БЕЗ АХВЯР

Як сцвярджаюць прафесіяналы-пажарнікі, вогненная стыхія ў гасцініцы — самае жудаснае, што можа паражыць чалавек, трапіўшы ў падобнае пекла.

Доўгія калідоры, шмат паверхаў — звычайна ў такіх пажарах ад удушша гіне шмат людзей. Таму, калі спрацавала аўтаматычная пажарная сігналізацыя ў адным з нумароў гасцініцы «Беларусь» у Брэсце, туды выехала адразу 9 пажарных аддзяленняў.

